Стаянка каменнага веку. За 3,5 км на паўночны ўсход ад горада, у пойме левага берага р. Проня, на дзюне.

Селішча эпохі Кіеўскай Русі. На месцы стаянкі.

Стаянка-1. За 1 км на ўсход ад горада, у пойме левага берага р. Проня, на дзюне.

Стаянка-2. За 1,1 км на ўсход ад горада, у пойме левага берага р. Проня, на дзюне.

Стаянка-3. За 1,2 км на ўсход ад горада, у пойме правага берага р. Сож, пры ўпадзенні ў яе р. Проня, на дзюне.

Царква Раства Багародзіцы. Пабудавана ў 1791 – 1793 гг. У цэнтры горада.

* * *

Помнік у гонар 50-годдзя вызвалення раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Ансамбль каменных пірамід, у цэнтры якога стэла з мемарыяльнай дошкай. Адкрыты 25 лістапада 1993 г.

Алея памяці чарнобыльскай бяды, дзе ўстаноўлена 11 стэл з назвамі вёсак. У цэнтры — камень з мемарыяльнай дошкай, дзе гаворыцца, што парк закладзены ў памяць аб адселеных вёсках у год дзесяцігоддзя Чарнобыльскай катастрофы.

Мемарыяльны камень на ўшанаванне памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў. У скверы 80-годдзя ВЛКСМ.

## З гісторыі населеных пунктаў Слаўгарадчыны

**АДАМІН,** былы фальварак, потым хутар у Кульшыцкім сельсавеце. З 1910 г. фальварак належаў дваранiну Ф.К.Крукоўскаму, 1 двор, 4 жыхары. Адносіўся да Журавіцкага рымска-каталіцкага прыхода.

**АДАМІНА,** былы маёнтак у Кульшыцкім сельсавеце. З 1908 г. маёнткам валодаў памешчык Крукоўскі. Зліўся з в. Кульшычы.

**АЗАРЫЧЫ,** вёска ў Лапаціцкім сельсавеце. Упершыню згадваецца ў інвентары Дубровенскім за 1560 г. На карце 1777 г. адзначаны Азарычы і вадзяны млын. У метрыцы Прапойскай царквы Раства Багародзіцы за 1859 г. зафіксавана в. Азарыч. У 1873 г. у Даўгамохскай воласці Быхаўскага павета, меўся хлебазапасны магазін. У 1877 г. пабудавана мураваная Троіцкая царква. У 1910 г. належала Устаненскаму сельскаму таварыству; 38 двароў, 267 жыхароў, у 1926 г. 420 жыхароў, чатырохкласная школа.

**АЗЕРСКА,** былое лясніцтва ў Гіжэнскім сельсавеце. У 1926 г. 10 жыхароў.

**АЗЯРЭЦ,** былы пасёлак у Гіжэнскім сельсавеце. На р. Гіжэнка. Меліся ставок, млын, крупадзёрка. Цяпер вуліца ў в. Гіжэнка. Іншыя назвы *Вазярэц, Вызярэц, Зярэц.*

**АЛЕЕЎШЧЫНА,** былы хутар у Кульшыцкім сельсавеце. На захад ад в. Кульшычы. У 1910 г. 10 двароў, 50 жыхароў. Адносіўся да Кульшыцкага праваслаўнага прыхода. Цяпер урочышча.

**АЛЕКСАНДРОЎКА,** былая вёска ў Васькавіцкім сельсавеце. Мясцовая назва *Ліксандраўка.* Цяпер вуліца Паўлючонкава ў в. Шаламы-1.

**АЛЕКСАНДРЫЯ,** былы фальварак у Баханскім сельсавеце. У 1910 г. быў 1 двор. Адносіўся да Журавіцкага рымска-каталіцкага прыхода.

**АЛЯКСАНДРАЎКА,** былая вёска ў Слаўгарадскім гарсавеце. Каля в. Курганаўка. Да Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. зямля Аляксандраўкі была сумежная з в. Шаламы і с. Міхайлоўскае.

**АЛЯКСАНДРАЎКА,** былы фальварак у Гіжэнскім сельсавеце каля р. Сож. Належаў дваранiну В.А.Судзілоўскаму. У 1910 г. 61 жыхар. Адносіўся да Азёрскага праваслаўнага прыхода.

**АЛЯКСАНДРАЎКА-1,** вёска ў Гіжэнскім сельсавеце. Мясцовыя назвы *Аліксандруўка, Ліксандруўка, Ліксандрыўка, Таўкачоўка, Малінаўка.* У 1750 г. 12 двароў, у 1884 г. 40 двароў, з іх 4 сталярныя, 189 жыхароў. У 1910 г. у Даўжанскай воласці Чэрыкаўскага павета, належала Аляксандраўскаму сельскаму таварыству; 46 двароў, 303 жыхары. Адносілася да Азёрскага праваслаўнага прыхода. У 1926 г. у вёсцы 427 жыхароў, чатырохкласная школа.

**АЛЯКСАНДРАЎКА-2,** вёска ў Гіжэнскім сельсавеце. У 1910 г. фальварак Аляксандраўка належаў дваранцы Рамідоўскай; 1 двор, 9 жыхароў. Адносіўся да

19. Зак. 4744

Азёрскага праваслаўнага прыхода. У 1926 г. у Аляксандраўцы-2 180 жыхароў. Іншая назва *Малінаўка*.

**АЛЯКСЕЕЎКА,** былы хутар у Васькавіцкім сельсавеце. Уладанне мешчаніна А.П.Мацішава. У 1910 г. 1 двор, 11 жыхароў; у 1926 г. 13 жыхароў. Адносіўся да Прапойскага праваслаўнага прыхода.

**АНДРЭЕЎКА,** былы хутар у Васькавіцкім сельсавеце. Уладанне мяшчан Кандрата і Антона Іванавых, Рамана Васільева і Івана Усцінава. У іх карыстанні было каля 70 дзесяцін зямлі, купленай у 1865 г. іх дзедам Іванам Пятровым. У 1910 г. у Прапойскай воласці Быхаўскага павета, 6 двароў, 48 жыхароў; у 1926 г. 53 жыхары. Адносіўся да Прапойскага праваслаўнага прыхода. Цяпер вуліца ў в. Шаламы-1. Іншыя назвы *Канстанцінаўка, Салабуда*.

**АНЕЛІН,** былы фальварак у Быханскім сельсавеце. У канцы XIX ст. маёнткам Анелін валодалі Лізавета Аляксандраўна, Мечыслаў і Людвіг Станіслававічы Выкоўскія. У 1910 г. у фальварку Анелін 1 двор. Адносіўся да Журавіцкага рымска-каталіцкага прыхода.

**АНІСАВА КУПЕЛА,** былы хутар у Кульшыцкім сельсавеце.

**АРЖАЎКА,** былая вёска ў Кульшыцкім сельсавеце. Мясцовыя назвы *Іржаўка, Аржаўкі, Луб-Камочышча, Ржаўка.*

**АСТРАВЫ,** былы хутар у Гіжэнскім сельсавеце. Мясцовыя назвы *Вайстравы, Выйстравы*. У 1926 г. 21 жыхар.

**АЎТУХОВА,** былы хутар у Васькавіцкім сельсавеце. Уладанне селяніна Аўтуха Астапава. Зліўся з в. Шаламы-1.

**АХОТАЎКА,** былая вёска ў Слаўгарадскім гарсавеце. На левым беразе р. Проня, насупраць в. Завад-Віравая. Паводле падання, жыхары Ахотаўкі былі ссыльныя.

**БАБЫ,** былы пасёлак у Свенскім сельсавеце. Цяпер у складзе в. Рэкта.

**БАКОЎШЧЫНА,** былы маёнтак у Кульшыцкім сельсавеце. За вёскамі Кульшычы, Забалацце, Хоцішча, па цячэнні р. Ухлясць. Мясцовыя назвы *Графшчына, Грабшчына, Бачкоўшчына*. Належаў пану Бачкову.

**БАЛОННЕ,** былы хутар у Гіжэнскім сельсавеце. Каля в. Чырвоная Слабада. Належаў А.Кісялёву.

**БАЛЬШАЯ ВІТАЛЬ,** былы пасёлак у Каменкаўскім сельсавеце. Мясцовыя назвы *Быльшая Вітыль* або *Бэльшая Вітэль*.

**БАРАДУЛІНКА,** былы хутар у Кульшыцкім сельсавеце.



На цэнтральнай плошчы Слаўгарада.

**БАРОЎКА,** былы хутар у Кульшыцкім сельсавеце. Каля вёсак Хачынка і Кулікоўка. Паводле падання, назва паходзіць ад значэнняў «бор», «пясчаная глеба», «ягады чарніцы». Уладанне двараніна Э.І.Ганіпроўскага. У 1879 г. 301 дзесяціна зямлі.

**БАРСУКІ,** былы пасёлак у Гіжэнскім сельсавеце. Мясцовыя назвы *Бырсукі*, *Бурсукі*. У 1926 г. у Целяшоўскім сельсавеце, 11 жыхароў.

**БАРСУКОЎКА,** вёска ў Гайшынскім сельсавеце. Мясцовыя назвы *Перадзел*, *Людкоў*. Паводле падання, узнікла з перасяленцаў суседніх вёсак Хляўно і Глінка (сучаснага Кармянскага раёна Гомельскай вобласці). Назва быццам паходзіць ад урочышча Барсукі, куды пераехалі хлявенцы. Вёска была падзелена паміж панамі, таму яе таксама называюць *Перадзел*. Барсукоўку называюць яшчэ *Людкоў*. Людзі сюды, у Людкоў, як гавораць паданне, пераехалі з-пад Быхава. У 1884 г. у Прапойскай воласці Быхаўскага павета, хлебазапасны магазін. У 1910 г. уваходзіла ў склад Барсукоўскага сельскага таварыства; 34 двары, 227 жыхароў. У 1926 г. 294 жыхары.

**БАТУРЫН,** былы хутар у Свенскім сельсавеце. Каля в. Чарнякоўка.

**БАХАНЬ,** былы фальварак у Баханскім сельсавеце. У 1910 г. каля с. Бахань.

**БАХАНЬ-1,** былая вёска ў Баханскім сельсавеце. Каля р. Баброўка. У 1884 г. 2 хлебазапасныя магазіны. У 1886 г. 75 двароў, 515 жыхароў, валаснoе праўленне, царкоўны прыход, школа, 2 ветраныя млыны, карчма. У 1910 г. належала Баханскаму 1-му сельскаму таварыству; 100 двароў, 795 жыхароў. Адносілася да Баханскага праваслаўнага прыхода.

**БАХАНЬ-2,** былая вёска ў Баханскім сельсавеце. У 1910 г. належала Баханскаму 2-му сельскаму таварыству; 43 двары, 300 жыхароў, валаснoе праўленне.

**БАХАНЬ,** вёска, цэнтр сельсавета. Мясцовая назва *Быхань*. У гістарычных крыніцах упамінаецца з XVI ст. З 1862 г. у пажыццёвым уладанні дваранкі Т.В.Шнейдэр, якой належалі 1311 дзесяцін зямлі, вадзяны млын, карчма. У 1882 г. існавала школа. Іншая назва *Чысць*.

**БАХАНЫ,** група былых хутароў у Васькавіцкім сельсавеце. На поўдні балота Чыстая Лужа і на паўночным захадзе ад в. Шаламы, на тэрыторыі калгаса «XVII партз'езд». У 1926 г. тут налічвалася 20 жыхароў.

**БАЧКОЎШЧЫНА,** былы маёнтак у Кульшыцкім сельсавеце. Каля вёсак Дабужа, Боўкі, Кульшычы, па цячэнні р. Ухлясць. Належаў пану Бачкову. Іншыя назвы *Бакоўшчына*, *Графшчына*, *Грабшчына*.

**БЕНКЕНДОРШЧЫНА,** былы маёнтак у Слаўгарадскім гарсавеце. Мясцовыя назвы *Бікіндоршчына*, *Мікіндоршчына*. Належаў памешчыку А.І.Бенкендорфу, які ў 1828 г. у чыне адстаўнога паручніка купіў Прапойскі маёнтак у графіні Вязьміцынавай. Графіня набыла яго ў 1825 г. у Дзмітрыя Яншына, сына надворнага саветніка Аляксандра Яншына. Мясцовыя жыхары часам так называюць в. Кабіна Гара, якая ўзнікла каля Слаўгарада.

**БЛАГАДАЦЬ,** вёска ў Каменкаўскім сельсавеце. Назва паходзіць ад прыгожага мясцовага геаграфічнага ландшафту. Паводле сведчання старажылаў, тут жылі паны Крапоткіны. У 1910 г. у фальварку Благадаць Старынскай воласці Чэрыкаўскага павета; 1 двор, 16 жыхароў. Належаў княгіне М.А.Крапоткінай. Адносіўся да Наваельненскага праваслаўнага прыхода. У 1926 г. пасёлак у Каменкаўскім сельсавеце.

**БОЛЬВАР,** былы фальварак у Лапаціцкім сельсавеце. Каля в. Улукі, на беразе р. Ляснянка.

**БОРКІ,** вёска ў Баханскім сельсавеце. На левым беразе р. Ухлясць. Пасля адмены прыгону (1861) тут купілі танную зямлю латышы. Перад 2-й сусветнай вайной яны прыехалі на радзіму. Але адзін латыш застаўся ў зяцях у адной з суседніх вёсак. Мясцовае насельніцтва выказвала сваё ўражанне, што латышы вельмі працавітыя людзі, маўклівыя і не вельмі кантактавалі з тутэйшымі жыхарамі.

**БОРКІ-1,** былы хутар у Баханскім сельсавеце. У 1910 г. належаў Боркаўскаму 1-му сельскаму таварыству; 1 двор, 8 жыхароў.

**БОРКІ-2,** былы хутар у Баханскім сельсавеце. У 1910 г. належаў Боркаўскаму 2-му сельскаму таварыству; 32 жыхары. Адносіўся да Баханскага праваслаўнага прыхода.

**БОЎШЧЫНА,** былы хутар у Лапаціцкім сельсавеце. У 1926 г. у Іванішчавіцкім сельсавеце.

**БРАК,** былы пасёлак у Свенскім сельсавеце. 8.8.1964 г. перайменаваны ў в. Дальняя.

**БРОДНІЦА,** былы фальварак у Ржаўскім сельсавеце. Уладанне дваранiна С.А.Каморскага. У 1871 г. 200 дзесяцін зямлі. У 1910 г. 2 двары, 7 жыхароў. Адносіўся да Журавіцкага рымска-каталіцкага прыхода. У 1926 г. тут быў пас. Бродніца, у якім налічваўся 41 жыхар. Іншыя назвы *Молатаў*, *Ржаўка-2*, *Бродня*.

**БРОДНЯ,** былы фальварак у Ржаўскім сельсавеце. Каля пас. Молатаў ці в. Ржаўка-2.

**БУБРЫКАВА ГАРА,** былы хутар у Васькавіцкім сельсавеце. Назва хутара паходзіць ад слова *бублікі*, якія любіў гаспадар. Цяпер в. Шаламы-1.

**БУГОР,** група былых хутароў у Слаўгарадскім гарсавеце каля в. Сіліна Поле. Называліся таксама *Гракoвы Хутары*.

**БУДАЕЎСКІ ХУТАР,** былы хутар у Кульшыцкім сельсавеце. Каля в. Забалаццe. Назва паходзіць ад прозвішча ўладальніка Будаёва ці Будаева.

**БУТОШНАЕ,** былы пасёлак у Гіжэнскім сельсавеце. У 1926 г. у Целяшоўскім сельсавеце, 30 жыхароў.

**БЫЧЫКАВА,** былы хутар у Васькавіцкім сельсавеце. Назва паходзіць ад прозвішча ўладальніка, селяніна *Аўхіма Бычанкова* (па-мясцоваму Бычык). Зліўся з в. Шаламы-1.

**БЯЗУЕВІЧЫ,** вёска ў Васькавіцкім сельсавеце. Існуе паданне, што былі два браты-асілкі Абіда і Вязула. Абіда жыў на месцы сучаснай в. Абідавічы Абідавіцкага сельсавета Быхаўскага раёна, Вязула — дзе цяпер в. Бязуевічы Слаўгарадскага раёна. Была ў іх адна сякера, якую браты перакідвалі адзін аднаму пры неабходнасці насячы дроў. Мясцовыя старажылы сведчылі, што назва Бязуевічы паходзіць ад слова «бэз». На картах: *Везувічы* (1850), *Кезуевічы* (1882).

Каля 1783 г. у вёсцы 45 двароў, 277 жыхароў. У 1884 г. 62 двары, у тым ліку 1 кравецкі і 2 кавальскія, 254 жыхары, хлебазапасны магазін. У 1910 г. у Бычанскай воласці Быхаўскага павета, належала Бязуевіцкаму сельскаму таварыству; 71 двор, 513 жыхароў. Адносілася да Гайшынскага праваслаўнага прыхода. У 1926 г. у Чарнякоўскім сельсавеце, 568 жыхароў.

**БЯЛЁВА,** былы хутар у Васькавіцкім сельсавеце. У 1926 г. у Гайшынскім сельсавеце, 47 жыхароў.

**БЯЛЁВА,** былы пасёлак у Свенскім сельсавеце. У 1926 г. у Чарнякоўскім сельсавеце, 16 жыхароў.

**БЯЛЁЎ,** былы хутар у Васькавіцкім сельсавеце. Уладанне Станкевічаў. Старажылы тлумачылі назву Бялёў тым, што тут рос дубовы і кляновы *белый*, *тyварный* лес. Верагодна, назва ўрочышча Бялёў паходзіць ад аднайменнай назвы балота, якое цягнецца ад в. Папоўка да в. Рудня. У 1926 г. было 33 жыхары.

**БЯРОЗАЎКА,** вёска ў Гіжэнскім сельсавеце. На левым беразе р. Проня. Да Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. — сяло. У 1708 г. у данясенні камандуючага корпусам Боўра Пятру І указваецца в. Бярозаўка: «Сего сентября 27 дня в пути, не дошед вески Березовки, получилъ ваш царского величества указ через Масора Чирикова. И пришед в тое веску Березовку, и стал промеж весак Березовки и Улуки. И сей ночи переберязь реку Проню, пойду до указанного места... А не доезжая того вески Березовки, в пути слышна была стрельба, и березовских жителей спрашивал и они сказали, что де неприятель вчерашней ночи ночевал в веске Грязивец и знатно, что тою вескою стрельба была». У 1783 г. 47 двароў, 265 жыхароў. У 1926 г. у Целяшоўскім сельсавеце, 348 жыхароў, чатырохкласная школа.

**БЯРОЗАЎКА,** былы фальварак у Гіжэнскім сельсавеце. У 1873 г. 3 рэвізскія і 3 прышлыя селяніны.

**ВАЙСТРАКОЎШЧЫНА,** былы хутар у Кульшыцкім сельсавеце. Уладальнік меў прозвішча Вайстрак. Іншая назва Вайстракова. Цяпер урочышча з назвамі *Вайстракоўшчына*, *Вайстракова*, *Вайстрякова*.

**ВАЛУЙКОВА,** былы хутар у Васькавіцкім сельсавеце. Каля в. Шаламы-2. Цяпер урочышча.

**ВАЛЫНЕЦ,** былы хутар у Васькавіцкім сельсавеце. Каля р. Пасека. Хутар межаваў з зямлёй сялян вёсак Урэчча і Шаламы-1. Іншыя назвы *Валынь*, *Новая Валынь*, *Казелец*.

**ВАЛЫНЬ,** былы хутар у Васькавіцкім сельсавеце, каля в. Шаламы. Меў таксама назву *Новая Валынь*. Належаў Ізава-

Ракітніцкаму сельскаму таварыству. Купілі ў 1909 г. 87 дзесяцін Валынскай губерні ў пана М.А.Ларанцэвіча. З 1914 г. урочышча *Валынь*.

**ВАРАНЦОЎ,** былы хутар ў Слаўгарадскім гарсавеце. На поўнач ад пас. Сіліна Поле.

**ВАСХОД,** былы пасёлак у Гіжэнскім сельсавеце. У 1926 г. у Целяшоўскім сельсавеце, 19 жыхароў.

**ВАСЬКАВІЦКІ ПАСЁЛАК,** былы пасёлак у Васькавіцкім сельсавеце. Узнік у 1920-я гады. У 1928 г. 67 жыхароў.

**ВАСЬКАВІЧЫ,** вёска, цэнтр сельсавета. Мясцовыя назвы *Васькавічы*, *Васьківічы*, *Васькевічы*, *Васкувічы*, *Васіківічы*. У гістарычных крыніцах згадваецца ў 1555 г. як сяло ў Прапойскай воласці. Паводле інвентара 1675 г., у Васькавічах 24 двары (дымы). Назва ад слова *воск*.

З канца XVIII ст. вёска належала Галіцыным і Алучынаўскаму. Адметнасцю гаспадаркі ў вёсцы ў канцы XVIII ст. з'яўлялася бортніцтва. Паводле рэвізіі 1772 г., у Васькавічах 139 жыхароў (беглых 21 чал.). У 1873 г. 449 рэвізскіх і прышлых сялян. У 1884 г. у Прапойскай воласці Быхаўскага павета; 93 двары, у тым ліку 6 бандарных, 409 жыхароў, хлебазапасны магазін. У 1910 г. належала Васькавіцкаму сельскаму таварыству, 143 двары, 1027 жыхароў. У 1913 г. 137 домаўласнікаў пайшлі на хутары. З 1912 г. існавала аднакласная царкоўнапрыходская школа, з 1918 г. — трохкласнае вучылішча. У 1926 г. 105 жыхароў. Перад вайной у вёсцы была сярэдняя школа.

**ВАЎЧКІ,** былы хутар у Васькавіцкім сельсавеце. Каля вёсак Шаламы-1 і Пагарэлае. Іншыя назвы *Ваўчкова*, *Воўк*, *Ваўкі*.

**ВІКТОРЫНА,** былы фальварак у Кульшыцкім сельсавеце. Цяпер частка в. Пчэльня. Іншыя назвы *Завадзішча*, *Клін*, *Ісценец*.

**ВІШКОЎКА,** былы пасёлак у Свенскім сельсавеце. Зліўся з в. Рэкта.

**ВОЙСТРАЎ,** былы хутар у Кульшыцкім сельсавеце. Каля в. Забалацце, сярод Вухава балота. У 1926 г. 6 жыхароў.

**ВЫГАР,** былы хутар у Васькавіцкім сельсавеце, каля в. Шаламы. За урочышчам Лысая Гара. Мясцовыя назвы *Выгарь*, *Выгырь*, *Выгар*, *Увыгар*, *Купля*.

**ВЫГАР,** былы пасёлак у Гіжэнскім сельсавеце. У 1926 г. у Целяшоўскім сельсавеце, 32 жыхары.

**ВЯЛІКАЯ ЗІМНІЦА,** вёска ў Баханскім сельсавеце. У гістарычных крыніцах упамінаецца каля 1600 г. як сяло ў маёнтку Тайманава. У 1884 г. меўся хлебазапасны магазін.

**ВЯЛІКІЯ РАГІ,** былая вёска ў Свенскім сельсавеце. У 1783 г. 85 двароў, 524 жыхары. Іншая назва *Рагі*.

**ГАЙШЫН,** былы маёнтак (мыза) у Васькавіцкім сельсавеце. Адносіўся да Журавіцкага рымска-каталіцкага прыхода.

**ГАЙШЫН,** вёска ў Васькавіцкім сельсавеце. У гістарычных крыніцах згадваецца ў 1708 г. у сувязі з падзеямі Паўночнай вайны 1700 – 1721 гг. Паводле рэвізіі 1773 г., у мястэчку Гайшын 510 рэвізскіх і прышлых сялян. У 1784 г. 2 сінагогі і 2 яўрэйскія малітоўныя дамы. У 1846 г. пабудавана драўляная царква Узнясення. У 1864 г. адкрыта народнае вучылішча, у 1889 – 1890 гг. у ім 52 вучні, у тым ліку 2 дзяўчынкі. З 1879 г. Гайшын — уласнасць Смяроўскага, які валодаў 1272 дзесяцінамі зямлі, вадзяным млынам і паромам цераз р. Сож. У 1884 г. 95 двароў, 450 жыхароў, 4 кравецкія двары, жыхары 20 двароў былі ў адыходніцтве, хлебазапасны магазін, царква, 2 яўрэйскія малітоўныя дамы, 2 ветракі. Двойчы на год праводзіліся кірмашы (5 мая і 1 кастрычніка). У 1910 г. у Прапойскай воласці Быхаўскага павета; 158 двароў, 1142 жыхары. З 1912 г. існавала аднакласная царкоўнапрыходская школа. З 20.8.1924 г. цэнтр сельсавета Прапойскага (з 1945 Слаўгарадскага) раёна. У 1926 г. 1245 жыхароў.

**ГАЛУБА,** былы хутар у Старынскім сельсавеце. Каля в. Кліны. У 1910 г. хутар (1 двор, 5 жыхароў) Старынскай воласці Чэрыкаўскага павета, належаў С.Заваротнаму. Адносіўся да Наваельнінскага праваслаўнага прыхода.

**ГАНЧАРОЎКА,** вёска ў Васькавіцкім сельсавеце. У гістарычных крыніцах вядома як урочышча, з 1830 г. хутар, уладальнікамі якога былі мяшчане І. і Л.Мельянцовы і П. Мацішаў (Матышаў). У 1910 г. 4 двары, 26 жыхароў. Адносіўся да Прапойскага праваслаўнага прыхода. У 1926 г. 33 жыхары. Ганчароўка як вёска вырасла ў час калектывізацыі, засялілася ў асноўным жыхарамі з суседніх вёсак Васькавічы і Пагарэлае.

**ГАРАДЗЕЦ,** былы хутар у Кульшыцкім сельсавеце. У 1910 г. належаў сялянам П.Карунцаву, З. і С. Юр'евым; 5 двароў, 22 жыхары. Адносіўся да праваслаўнага прыхода. Іншая назва *Крынічкі*.

**ГАРАДЗЕЦКІ ПРУД,** былы маёнтак у Гіжэнскім сельсавеце. На кургане каля р. Крупка. Маёнтак належаў пану Гарадзецкаму (адсюль назва). Называўся таксама *Гарадзец*.

**ГАРАДОК,** былы старажытны горад у Васькавіцкім сельсавеце. На правым беразе летапіснай р. Пясчанка. У Гарадку былі царква і млын, пра што сведчаць назвы ўрочышчаў Прудзішчы і Царкавянішча, а таксама рэшткі мошчанай дарогі (гаці) Машчонка (цяпер урочышча). У гэтым месцы вялікая колькасць старажытных (радзіміцкіх) курганоў (паводле этнографа і археолага І.А.Сербава — 170). У 1917 г. І.А.Сербаў праводзіў тут раскопкі. Гарадок быў спалены ў ходзе ваенных дзеянняў. Цяпер урочышча.

**ГАРДЗЯШОЎ,** былы хутар у Васькавіцкім сельсавеце. Цяпер частка в. Шаламы-1, паміж вуліцамі Сямідворка і Карэлія ці Цiцiлiнава вуліца.

**ГАЎРЫЛЬЧЫКАВА,** былы хутар у Васькавіцкім сельсавеце. Належаў Чачорам. Зліўся з в. Шаламы-1.

**ГІЖЭНКА,** вёска, цэнтр сельсавета. Мясцовыя назвы *Ніжэнка*, *Йіжэнка*, *Іжэнка*. Назва вёскі паходзіць ад назвы р. Гіжэнка. У вёсцы 3 вуліцы: *Месны* або *Слабада*, *Азярэц* і *Кайстрышнік*.

У 1777 г. 7 двароў, 43 жыхары, у 1783 г. 12 двароў, ставок, млын, сукнавальня, карчма. У 1783 г. і 1848 г. уваходзіла ў склад маёнтка пана Гарадзецкага Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губерні. З 1873 г. в. Гіжэнка лічылася дзяржаўным уладаннем. У 1884 г. 33 двары, у тым ліку 10 сталярных і 6 бандарных, 163 жыхары. У 1910 г. належала Гіжэнскаму сельскаму таварыству; 48 двароў, 395 жыхароў. Адносілася да Целяшоўскага праваслаўнага прыхода. У вёсцы былі ставок, вадзяны млын, крупадзёрка. У 1926 г. 377 жыхароў, чатырохкласная школа. Да Вялікай Айчыннай вайны пабудавана новая школа, было 9 класаў. У вайну вёска поўнасцю згарэла, пасля вызвалення адрадзілася. У 1956 г. 100 двароў.

**ГІЖЭНКА,** былая сядзіба ў Гіжэнскім сельсавеце. У 1910 г. належала казне, 1 двор, 2 жыхары. Адносілася да Целяшоўскага праваслаўнага прыхода.

**ГІЖЭНКА,** былая сяльца ў Гіжэнскім сельсавеце, 1 двор.

**ГІЖЭНКА,** былое сяльцо ў Гіжэнскім сельсавеце. 3 жылыя хаты, будынкаў усяго 6.

**ГОРКІ,** былы хутар у Кульшыцкім сельсавеце. Каля балота Горкі, за 5 км ад былога хутара Луты. У 1910 г. у Баханскай воласці Быхаўскага павета, уласнасць сялян Б.В. і А.Лутавых, праваслаўных Кульшыцкага прыхода; 3 двары, 32 жыхары. У 1926 г. 41 жыхар. Іншая назва *Палоса*.

**ГОРНА,** былая вёска ў Гіжэнскім сельсавеце. У XVII – XVIII ст. у складзе Прапойскага старроства. У 1750 г. 4 двары. Цяпер урочышча (поле) каля в. Любаны.

**ГРАБШЧЫНА,** былы маёнтак у Кульшыцкім сельсавеце. Каля вёсак Дабужа, Боўкі, Кульшычы. Графіня, уладальніца маёнтка, жыла ў в. Грудзінаўка (Быхаўскі раён). Паводле падання, графіня была павівальнай бабкай цара Мікалая II. Іншыя назвы *Графшчына*, *Бакоўшчына*, *Бачкоўшчына*.

**ГРАДЗЬ,** былы пасёлак у Ржаўскім сельсавеце. Каля хутара Струшы і фальварка Бродніца. У 1926 г. 33 жыхары.

**ДАБРАМЫСЛ,** былая вёска ў Гіжэнскім сельсавеце. На поўнач ад в. Гіжэнка. Пазначана на карце 1777 г.

**ДАБРАНКА,** вёска ў Старынскім сельсавеце. Іншыя назвы *Добра*, *Добря*, *Хрыстафораўка*.

**ДАЛЬНІ СТРУШАЎ,** былы хутар у Кульшыцкім сельсавеце. Зліўся з в. Ржаўка-1.

**ДАЛЬНЯЯ,** вёска ў Свенскім сельсавеце. Названа так у выніку перайменавання пас. Брак. Іншая назва *Брак*.

**ДАНІЛАЎКА,** былы хутар у Гіжэнскім сельсавеце. У 1926 г. у Целяшоўскім сельсавеце, 6 жыхароў.

**ДАШКАЎКА,** вёска ў Гіжэнскім сельсавеце. Мясцовая назва *Дашкоўка*. У 1783 г. у засценку Дашкаўка налічвалася 10 шляхецкіх сем'яў. У 1910 г. у Лабанаўскай воласці Чэрыкаўскага павета, належала Дашкаўскаму сельскаму таварыству; 24 двары, 168 жыхароў. Адносілася да Целяшоўскага праваслаўнага прыхода. У 1926 г. у Целяшоўскім сельсавеце, 237 жыхароў, чатырохкласная польская школа.

**ДЗЯМ'ЯНАЎКА,** былы пасёлак у Васькавіцкім сельсавеце. Узнік у 1926 г. з хутароў, 71 жыхар.

**ДЗЯРЭЎНЯ,** былая вёска ў Гіжэнскім сельсавеце. Вядома з 1572 г. як сяло. Цяпер назва вуліцы ў в. Любаны.

**ДОБРЫ ДУБ,** вёска ў Баханскім сельсавеце. Назва паходзіць ад таго, што тут добрая зямля і расло многа дубоў. У XVIII ст. уладанне князя Галіцына, 31 двор, 208 жыхароў, вадзяны млын. У 1910 г. у Баханскай воласці Быхаўскага павета; 109 двароў, 678 жыхароў. Адносілася да Дабрадубскага сельскага таварыства. Уваходзіла ў Зімніцкі сельсавет.

**ДОЎБІН ВОСТРАЎ,** былая лясная дача ў Лапаціцкім сельсавеце. Каля в. Лапацічы. У 1823 г. уладанне генерал-маёра Ц.П.Калянкоўскага. У 1910 г. у Прапойскай воласці Быхаўскага павета, належала селяніну П.П.Стральцову; 1 двор, 7 жыхароў. Адносілася да Кульшыцкага праваслаўнага прыхода.

**ДУБНА,** вёска ў Каменкаўскім сельсавеце. Мясцовыя назвы *Дубня*, *Дубіна*, *Дубіня*. У гістарычных крыніцах згадваецца Дубна (1675), Добна (1752).

З 1835 г. уладанне Бенкендорфа. У 1884 г. 25 двароў, у тым ліку 1 кравецкі, 197 жыхароў. У 1910 г. у Старынскай воласці Чэрыкаўскага павета, належала Дубнаўскаму сельскаму таварыству, 46 двароў, 332 жыхары. Адносілася да Гайшынскага праваслаўнага прыхода. У 1926 г. дзейнічала чатырохкласная школа.

**ДУБРАЎКА,** вёска ў Кульшыцкім сельсавеце. Узнікла ў 1868 г. як хутар на зямлі (155 дзесяцін), якую купіў селянін Арыён Ануфрыеў, жыхар в. Чарнякоўка. Пазней сюды прыйшлі жыхары з в. Жаролы. У 1910 г. у Баханскай воласці Быхаўскага павета, належаў Дубраўскаму сельскаму таварыству; 7 двароў, 59 жыхароў. Адносіўся да Кульшыцкага праваслаўнага прыхода. У 1926 г. 42 жыхары.

**ДУБЯНЁЎКА,** былы хутар у Васькавіцкім сельсавеце. На захад ад в. Урэчча. У 1910 г. у Прапойскай воласці Быхаўскага павета, уладанне мешчаніна П.В.Грыневіча; 1 двор, 7 жыхароў. Адносіўся да Кульшыцкага праваслаўнага прыхода.

**ЖАЛЕЗЕНКА,** былы хутар у Гіжэнскім сельсавеце. За 5 км ад в. Гіжэнка. У 1910 г. у Даўжанскай воласці Чэрыкаўскага павета, 2 двары, 10 жыхароў. Адносіўся да Даўжынскага праваслаўнага прыхода. У 1926 г. 5 жыхароў. Цяпер урочышча.

**ЖАЛЕЗІНКА,** вёска ў Лапаціцкім сельсавеце. Узнікла ў 1894 г. У пана Трускоўскага купілі зямлю з лесам жыхары вёсак Хізы, Грамыкі, Прысно, Свяцілавічы, Пацёсы, Гута, Жалезнікі (75 сем'яў).

З 1910 г. у Жалезінцы працавала трохкласнае земскае вучылішча. Іншыя назвы *Новыя Жалезнікі*, *Зялезінка*.

**ЖАРОЛЫ,** вёска ў Кульшыцкім сельсавеце. Паходжанне назвы вёскі звязана з ямамі (жарало) пасля выгарання торфу. Мясцовая назва *Жарэлы*. У 1675 г. мелася 14 двароў (дымоў), у 1681 г. — 13, у 1750 г. — 11. Паводле рэвізіі 1773 г., 197 жыхароў (беглых 13 чал.). У 1777 г. 49 двароў, 205 жыхароў, у 1884 г. 50 двароў, у тым ліку 1 двор калёснікаў, 291 жыхар, хлебазапасны магазін. У 1910 г. у Баханскай воласці Быхаўскага павета, належала Жарольскаму сельскаму таварыству; 90 двароў, 549 жыхароў. Адносілася да Кульшыцкага праваслаўнага прыхода. У 1926 г. 572 жыхары, чатырохкласная школа.

**ЖУРАВЕЛЬ,** былы пасёлак у Васькавіцкім сельсавеце. Мясцовая назва *Жураўвель*. На поўнач ад в. Шаламы-2, востраў сярод балота Чыстая Лужа. Паводле падання, яшчэ ў часы Пятра I тут плавалі баржы, на якіх везлі бочкі з нарабаваным золатам. Бочкі былі патоплены ў моры (балоце). У XIX ст. прыязджалі з Масквы шукальнікі з планамі і картамі, шукалі золата. Яны наймалі рабочых, якія прабівалі торф да цвёрдага грунту. Вынікі пошукаў невядомыя. У 1926 г. тут жыло 17 чалавек. Іншыя назвы *Жураўка*, *Жураўлёў Востраў*.

**ЗАБАЛАЦЦЕ,** вёска ў Гіжэнскім сельсавеце. У 1783 г. 19 двароў, 115 жыхароў. У 1910 г. у Даўжанскай воласці Чэрыкаўскага павета, каля р. Крупка, належала Забалацкаму сельскаму таварыству; 43 двары, 274 жыхары. Адносілася да Цяляшоўскага праваслаўнага прыхода. У 1926 г. 268 жыхароў.

**ЗАБАЛОЦЦЕ,** былы хутар у Кульшыцкім сельсавеце. Мясцовыя назвы *Забылыцця*, *Забалоцьця*. Да 1908 г. уладанне пана Ляснеўскага, потым яго зяця Івана Сінчанкова. З 1910 г. належаў сялянам

А.Цімафееву і І.Андрэеву; 3 двары, 19 жыхароў. Адносіўся да Кульшыцкага праваслаўнага прыхода.

**ЗАБЫЧАННЕ,** былы пасёлак у Васькавіцкім сельсавеце. У 1926 г. 107 жыхароў.

**ЗАВАД,** былы пасёлак у Слаўгарадскім гарсавеце. У канцы XVIII ст. 11 двароў, 76 жыхароў. Працавалі дзягцярны, цагляны і вінакурны заводы. Цяпер назва вуліцы ў в. Завад-Віравая.

**ЗАВАД-ВІРАВАЯ,** вёска ў Слаўгарадскім гарсавеце. Узнікла ў 1873 г. у выніку аб'яднання вёсак Завод і Віравая. На поўдні быў завод, дзе гналі з карчоў дзёгаць, шкіпінар, выпальвалі кавальскі вугаль, а пазней абпальвалі цэглу. На поўначы, на правым беразе р. Проня, недалёка ад упадзення яе ў р. Сож была в. Віравая. Паводле рэвізіі 1772 г., у в. Віравая 62 жыхары (беглых 21 чал.). У 1884 г. у Прапойскай воласці Быхаўскага павета, 57 двароў, у тым ліку 12 возчыцкіх, 221 жыхар, жыхары 6 двароў былі ў адыходніцтве, хлебазапасны магазін. У 1910 г. 95 двароў, 632 жыхары. У 1918 г. існавала трохкласнае вучылішча. У 1926 г. 761 жыхар, чатырохкласная школа. Іншыя назвы *Завад*, *Завод*, *Смалакурны Завод*, *Завод Віравая*, *Яравая*, *Міравая*.

**ЗАВОД,** былая вёска ў Слаўгарадскім гарсавеце. Узнікла побач са смалакурным заводам каля в. Віравая. У XVIII ст. яна ўжо існавала пад назвай *Слабада Завод*, пра што сведчыць метрыка Прапойскай царквы (1794). У 1873 г. аб'яднана з в. Віравая. Разам яны тады мелі 120 рэвізскіх і 134 прышлых душ.

**ЗАВОДЗІШЧА,** былы фальварак у Кульшыцкім сельсавеце. У 1910 г. каля р. Мар'іна, належаў дваранін А.А.Валковічу; 1 двор, 6 жыхароў. Адносіўся да Кульшыцкага праваслаўнага прыхода. Зліўся з в. Пчэльня. Іншыя назвы *Завад*, *Пчэльня*.

**ЗАГЛІННАЕ,** вёска ў Гіжэнскім сельсавеце. На карце 1777 г. адзначана разам з вадзяным млынам. У 1783 г. 21 двор, 101 жыхар. У 1910 г. каля Руднянскага балота, належала Заглінскаму сельскаму таварыству; 39 двароў, 274 жыхары. Адміністрацыйна адносілася да Даўжанскай воласці Чэрыкаўскага павета і Целяшоўскага праваслаўнага прыхода. У 1926 г. у Целяшоўскім сельсавеце, 275 жыхароў. У 1961 г. 40 двароў, чатырохкласная школа. Іншая назва *Галуза, Заглінна* (1777).

**ЗАДНІ КУТ,** былы хутар у Свенскім сельсавеце. У 1926 г. 7 жыхароў.

**ЗАКРУПЕЦ,** вёска ў Гіжэнскім сельсавеце. Назва паходзіць ад р. Крупка. На карце Старабыхаўскага павета 1777 г. адзначана разам з вадзяным млынам. У 1783 г. 45 двароў, 262 жыхары. У 1910 г. у Даўжанскай воласці Чэрыкаўскага павета, належала Закрупецкаму сельскаму таварыству; 59 двароў, 407 жыхароў. Адносілася да Ляцягаўскага праваслаўнага прыхода. У 1926 г. 377 жыхароў.

**ЗАЛЯСНОЙ,** былы хутар у Лапаціцкім сельсавеце. Каля в. Чырвоная Слабада (Красная Слабада).

**ЗАПАЛЯННЕ,** вёска ў Кульшыцкім сельсавеце. Узнікла пасля адмены прыгону (1861). Асноўная частка жыхароў перасялілася з в. Кульшычы. У 1910 г. в. Запалянне (у архіўных матэрыялах хутар) у Прапойскай воласці Быхаўскага павета, 17 двароў, 153 жыхары. Адносілася да Кульшыцкага праваслаўнага прыхода. У 1926 г. 169 жыхароў, чатырохкласная школа.

**ЗАРЭЧЧА,** былая вёска ў Васькавіцкім сельсавеце. У 1908—1910 гг. жыхары вёскі мелі 36 надзелаў зямлі. У 1910 г. адасобіліся ад жыхароў в. Васькавічы і ўтварылі сваё сельскае таварыства, у якое ўваходзіла 27 домаўласнікаў. У 1926 г. в. Зарэчча лічылася пасёлкам, налічвала 23 жыхары.

**ЗАРЭЧЧА,** былая вёска ў Баханскім сельсавеце. Вядома з 1777 г. Злілася з в. Вялікая Зімніца.

**ЗАХАРОНКІ,** былы хутар у Кульшыцкім сельсавеце. Каля в. Кульшычы. Цяпер урочышча Захаронкі, або Захарава Лашчына.

**ЗАХОДЫ,** былы хутар у Гіжэнскім сельсавеце. У 1926 г. у Целяшоўскім сельсавеце, 8 жыхароў.

**ЗАХОДЫ,** былы хутар у Кульшыцкім сельсавеце. Назва, відаць, паходзіць ад значэння слоў *захад*, *заход*, *заходнае месца* — прыдатнае для жыццядзейнасці. У 1910 г. у Прапойскай воласці Быхаўскага павета, каля р. Хоцішча, належаў сялянам В.Якаўлеву, С.Пахомаву і М.Грыгор'еву; 4 двары, 23 жыхары. Адносіўся да Кульшыцкага праваслаўнага прыхода.

**ЗАЦІШША,** былы пасёлак у Кульшыцкім сельсавеце. У 1926 г. 19 жыхароў.

**ЗАЦІШША,** вёска ў Баханскім сельсавеце. У канцы XIX ст. — зямля маёнтка Зацішша. У 1910 г. хутар у Баханскай воласці Быхаўскага павета, 1 двор. Адносіўся да Журавіцкага рымска-каталіцкага прыхода.

**ЗЕМЛЯДЗЕЛЕЦ,** былы пасёлак у Васькавіцкім сельсавеце. У 1926 г. 28 жыхароў.

**ЗІМНІЦА,** вёска ў Баханскім сельсавеце. Назва паходзіць ад слова *зімні* (халодны). На карце 1777 г. пазначана як асобная вёска — Зімніца, у пазнейшых крыніцах — Вялікія Зімніцы. У 1886 г. у Баханскай воласці Быхаўскага павета, 108 двароў, 755 жыхароў, царква, карчма, ветраны млын. У 1910 г. належала Вяліказімніцкаму сельскаму таварыству; 172 двары, 1200 жыхароў. Адносілася да Зімніцкага праваслаўнага прыхода. У 1912 г. існавала аднакласнае царкоўнапрыходскае вучылішча. З 1956 г. у Журавіцкім, Быхаўскім, з 1959 г. у Слаўгарадскім раёнах. Іншая назва *Вялікая Зімніца*.

**ЗІМНІЦА-ІЗ'ІШЧА,** былая вёска ў Баханскім сельсавеце. Вядома з 1777 г.

**ЗІМНІЦА МАЛАЯ,** вёска ў Баханскім сельсавеце. Вядома з 1777 г. У 1884 г. у Баханскай воласці Быхаўскага павета. У 1886 г. каля р. Белая, 77 двароў, 628 жыхароў, карчма. У 1910 г. належала Малазімніцкаму сельскаму таварыству; 113 двароў, 850 жыхароў. Адносілася да Зімніцкага праваслаўнага прыхода. Цяпер афіцыйная назва Малая Зімніца.

**ЗІМНІЦА СЯРЭДНЯЯ,** былая вёска ў Баханскім сельсавеце. Вядома з 1777 г.

**ЗМЕЕВА,** былы пасёлак у Свенскім сельсавеце. Каля в. Чарнякоўка. У 1926 г. 96 жыхароў. Цяпер урочышча Змяіннік.

**ІВАНАЎКА,** былы пасёлак у Кульшыцкім сельсавеце. У 1926 г. 17 жыхароў.

**ІВАНІШЧАВІЧЫ,** былы маёнтак у Лапаціцкім сельсавеце. У 1910 г. на р. Хоцінка, належаў двараніну П.І.Трускоўскаму; 1 двор. Адносіўся да Боўкаўскага праваслаўнага прыхода. Іншая назва *Іванішавічы*.

**ІВАНІШЧАВІЧЫ,** вёска ў Лапаціцкім сельсавеце. Назва вёскі, верагодна, паходзіць ад імя Іван. Вядома з 1555 г. як сяло *Іванішавічы*. У 1783 г. уласнасць тытулярнага саветніка Г.С.Ляшнеўскага; 424 жыхары. У 1884 г. 53 двары, у тым ліку 1 кавальскі; 332 жыхары, хлебазапасны магазін. У 1910 г. у Даўгамохскай воласці Быхаўскага павета, на р. Хоцінка; 108 двароў, 660 жыхароў. Адносілася да Боўкаўскага праваслаўнага прыхода. У 1926 г. у Іванішчавіцкім сельсавеце, дзейнічала чатырохкласная школа і жылі 2172 чалавекі.

**ІКАНОРАВА,** былы хутар у Васькавіцкім сельсавеце. На ўсход ад в. Шаламы. Належаў селяніну Ніканору Шаўцову. Зліўся з в. Шаламы. Іншыя назвы *Ніканорава*, *Іканорынкава Гара*, *Ніканорынкава Гара*.

**ІСЦЕНЕЦ,** былы фальварак у Кульшыцкім сельсавеце. Цяпер частка в. Пчэльня. Іншыя назвы *Заводзішча*, *Завадзішча*, *Клін*, *Пчэльня*, *Вікторына*, *Завод*.

**ІХІН,** былы населены пункт у Слаўгарадскім гарсавеце. Пазначаны на картах XVIII ст. у месцы ўпадзення Проні ў Сож.

**КАБІНА ГАРА,** вёска ў Слаўгарадскім гарсавеце. За 3 км ад г. Слаўгарад. Мясцовыя назвы *Кабіна Гыра*, *Кабінныя Гыра*, *Кабінна Гара*, *Камінныя Гара*. У пачатку XX ст. тут быў *нісхадзімы* (непраходны) лес, які высеклі купцы. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. на гэтым месцы сталі будавацца пасёлкі. Першы пасёлак называлі *Пралетарыя* (першы калгас атрымаў назву таксама *Пралетарыя*). Пасяліліся тут *адны ліцом прылітары*. Другі пасёлак, Крамянскі, насялілі жыхары з в. Крамянка, трэці пасёлак, Руднянскі, — жыхары з в. Рудня. Вакол в. Кабіна Гара былі гравійныя ўзгоркі. Гравій з іх звезлі на будаўніцтва сельскіх дарог і шашы Масква — Варшава. Паводле падання, калі была тут пушча, то на горцы стаяла нібы вартоўня, у якой жыў хтосьці Кабін. У 1926 г. 33 жыхары. Іншыя назвы *Пралетарыя*, *Бенкендоршчына*, *Менкендоршчына*.

**КАБІНА ГАРА № 1,** былы пасёлак у Слаўгарадскім гарсавеце. У 1926 г. 4 жыхары.

**КАБІНА ГАРА № 2,** былы пасёлак у Слаўгарадскім гарсавеце. У 1926 г. 21 жыхар.

**КАДУЛІНА,** былы маёнтак у Кульшыцкім сельсавеце. Паміж вёскамі Кулікоўка і Жаролы. Іншая назва *Кадуліўшчына*.

**КАЗАКОЎКА,** вёска ў Каменкаўскім сельсавеце. На правым беразе р. Якушоўка. Паводле звестак беларускага археолага

К.М.Палікарповіча, в. Казакоўка каля 1877 г. была сселена на сучаснае месца (разам з в. Папараткі) панам Макавецкім. У 1910 г. у Наваельненскай воласці Чэрыкаўскага павета, належыла Крыўліцкаму сельскаму таварыству; 27 двароў, 257 жыхароў. Адносілася да Папараткаўскага праваслаўнага прыхода. Магчыма, назва Казакоўка мае сувязь з перыядам казацтва на Беларусі, калі Быхаў быў пагранічным горадам Рэчы Паспалітай, а Прапойск быў заняты рускімі войскамі. Каля Прапойска і далей па правым беразе Сажа да Рослаўля праходзіла граніца паміж Рэччу Паспалітай і Аўтаномнай казацкай воласцю (паводле Зборaўскага дагавора 1649). Назва вёскі можа быць звязана таксама з попісамі насельніцтва Слаўгарадчыны ў казацкія палкі чавускага палкоўніка Нячая.

**КАЗІНКА,** былы пасёлак у Васькавіцкім сельсавеце. У 1926 г. 109 жыхароў.

**КАЗЛОЎКА,** былы хутар у Гіжэнскім сельсавеце. У 1926 г. у Целяшоўскім сельсавеце, 8 жыхароў

**КАЙСТРЫШНІК,** былы пасёлак у Гіжэнскім сельсавеце. Узнік у 1920-я гады. Цяпер адна з трох вуліц у в. Гіжэнка. Іншыя назвы *Кастрышнік*, *Кастрычнік*.

**КАЛІНІНСКІ,** былы пасёлак у Свенскім сельсавеце. У 1926 г. у Чарнякоўскім сельсавеце, 50 жыхароў.

**КАМЕНКА,** былы маёнтак у Каменкаўскім сельсавеце. У 1892 г. на р. Каменка.

**КАНАПЛЯННІКАВА,** былы хутар у Васькавіцкім сельсавеце. Назва паходзіць, верагодна, ад прозвішча ўладальніка — Канапляніка ці Канапляннікава, у якога было многа дзяцей. Тут дзеці атаясамліваюцца з канопляמі. Зліўся з в. Шаламы-2.

**КАНСТАНЦІНАЎКА,** былы хутар у Кульшыцкім сельсавеце. У 1910 г. каля в. Мар'іна, належаў двараніну К.І.Юр'евічу; 1 двор, 7 жыхароў. Адносіўся да Кульшыцкага праваслаўнага прыхода.

**КАРЖОЎШЧЫНА,** былы хутар у Васькавіцкім сельсавеце. Каля в. Цярахоўка.

**КАРПАЎШЧЫНА,** былы хутар у Слаўгарадскім гарсавеце. Належаў мешчаніну Н.Прадалінскаму. У 1910 г. у Прапойскай воласці Быхаўскага павета, каля шашы Масква — Варшава; 1 двор, 4 жыхары. Адносіўся да Прапойскага праваслаўнага прыхода.

**КАЎЧЭГ,** былы хутар у Васькавіцкім сельсавеце. Паміж вёскамі Папоўка і Рудня. Мясцовая назва *Калчэг*, афіцыйная — *Ноеў Каўчэг*. У 1926 г. 47 жыхароў. Іншыя назвы *Поля пыд Калчэг*, *Поля ў Калчэзі*, *Ноеў Калчэг*.

**КАШАЛЁВА,** вёска ў Лапаціцкім сельсавеце. Першымі перасяленцамі былі Семчанкі з в. Шаламы. У час калектывізацыі вёска дазасялілася выхадцамі з вёсак Прудок, Рагі, Шаламы. У 1926 г. у Рабавіцкім сельсавеце, 173 жыхары. У час Вялікай Айчыннай вайны шмат разоў бамбілася і спальвалася гітлераўцамі як партызанская.

**КАШАЛЁЎ,** былая вёска ў Лапаціцкім сельсавеце. Ва ўрочышчы Стары Кашалёў. Узнікла ў 1910 г. у сувязі з купляй сялянамі (12 сем'яў) з Буда-Кашалёва Гомельскай вобласці 400 дзесяцін зямлі ў пана Трускоўскага.

**КАШАЛЁЎ,** былы хутар у Лапаціцкім сельсавеце. Каля в. Чырвоная Слабада (Красная Слабада). Уладальнік Іван Фёдаравіч Кашалёў.

**КАШАРКА,** былая сядзіба ў Слаўгарадскім гарсавеце. Належала Упраўленню Маскоўска-Варшаўскай шашы. У 1910 г. 1 двор, 5 жыхароў. Адносілася да Прапойскага праваслаўнага прыхода. Цяпер урочышча.

**КІРАЛАЎСКІ,** былы пасёлак у Свенскім сельсавеце. У 1926 г. у Чарнякоўскім сельсавеце, 72 жыхары.

**КІРЫЛАВА,** былы хутар у Васькавіцкім сельсавеце. Належаў селяніну Кірылу Лазьбянкову, якому пан даў зямлю за майстэрскае крыццё стрэх. Іншая назва *Кірыльчыкава*.

**КІРЭЕВА ГАРА,** былы хутар у Васькавіцкім сельсавеце. На правым беразе р. Пясчанка. Належаў Якаўчыкам. Іншыя назвы *Прылёпаўка*, *Кірэеў*, *Яшкін*.

**КЛІМНА,** былая вёска ў Лапаціцкім сельсавеце. Каля в. Рабавічы. У 1783 г. 15 двароў, 56 жыхароў. Відаць, іншая назва *Кляншоль*.

**КЛІНЫ,** вёска ў Каменкаўскім сельсавеце. Назва вёскі паходзіць ад таго, што тут р. Сож робіць выгіб у выглядзе кліна. У 1835 г. у метрыцы Прапойскай царквы значыцца як уласнасць Бенкендорфа. У 1871 г. гэта мясцовасць вядома і пад на-

звай урочышча *Кліны* (6136 дзесяцін зямлі; вадзяны млын), якое належала дваранцы А.А.Мурамцавай. У 1884 г. у в. Кліны 22 двары, у тым ліку 1 кравецкі і 1 бондарскі, 71 жыхар. У 1910 г. належала Кліноўскаму сельскаму таварыству, 23 двары, 195 жыхароў. Адносілася да Прапойскага праваслаўнага прыхода. Пазней жыхары вёскі часткова перасяліліся ў Вішоўскі сельсавет Бялыніцкага раёна. Славяцца Кліны крыніцай карставага паходжання *Сіні Калодзеж* (*Сіній Калодзісь*). Паводле падання, тут б'е з зямлі 120 ключоў. Вада на паверхні нагадвае ваду пры кіпенні, а люстра яе мае блакітны колер (мясцовыя жыхары блакітны і сіні колер атаясамліваюць). Паверхня люстра вады мае ў дыяметры каля 10 м. Крыніца знаходзіцца на высокім месцы, сярод поля. Вада вельмі чыстая і вельмі халодная. Дна ніхто з дапамогай жэрдак не дастаў. Крыніца лічыцца святой, з лячэбнай вадой. На свята Макаўе (Макавей) 14 жніўня тут правіцца набажэнства ў 11-ю пятніцу пасля Вялікадня. Да Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. тут была капліца, якая цяпер аднаўлена. З крыніцы выцякае р. Галуба і ўпадае ў Сож злева. Паводле аднаго з паданняў, крыніца Сіні Калодзеж узнікла тады, калі ў Прапойску жыла багатырка Кацярына. Да яе сваталіся жаніхі. Сцяпана яна любіла, але ён быў не такі дужы, як нялюбы жаніх Іван. Яна сказала, што пойдзе замуж за таго, хто далей кіне валун з высокага правага берага Сожа, з Прапойска, на ўсход, на луг. Нялюбы Іван кінуў агромністы валун якраз туды, дзе цяпер в. Кліны. Слабейшы любы Сцяпан кінуў не так далёка. Кацярына пайшла і стала на камень нялюбага Івана (на камені быў след, камень разбілі і завезлі пазней на будаўніцтва шашы Масква — Варшава). І сказала: «Лепш пайду вадой служыць, чым з нялюбым жыць». Потым падскочыла, ударылася аб валун, разбілася і раптам тут жа разлілася вялікім люстрам крыніцы. Пазней, кажуць, ляснік Шэпіт абходзіў лес і каля крыніцы на камені ўбачыў прыгожую русалку, якая грэбнем расчэсвала доўгія косы. Быў сонечны дзень. Ляснік хацеў схаваць адзенне, схапіць русалку. Пад нагой, як падкрадваўся, хруснула галінка. Русалка павярнула галаву і сказала: «А, Шэпіт, будзе ў твой род патопа». Сама знікла ў крыніцы. У той жа год у яго на Пятра ўтапілася ў Сожы дачка.

У 1851—1899 гг. пасля назвы Кліны пісалі другую назву вёскі — *Слабада Сіняя*. Іншая назва *Сіні Калодзезь*.

**КРАМЯНКА,** вёска ў Старынскім сельсавеце. Назва вёскі паходзіць ад залежаў крэменя на левабярэжжы Сажа. Жыхары Крамянкі выраблялі (*ліլі*) млынавыя жорны, якія былі прадметам гандлю на Беларусі і Украіне (па Сажы іх сплаўлялі і перавозілі па сушы).

У 1884 г. 40 двароў, у тым ліку 1 бандарны, 312 жыхароў. У 1910 г. у Старынскай воласці Чэрыкаўскага павета на тракце, каля р. Сож, належала Крамянскаму сельскаму таварыству; 79 двароў, 616 жыхароў. Адносілася да Прапойскага праваслаўнага прыхода. У 1926 г. 733 жыхары, чатырохкласная школа.

**КРАСНАЕ,** былы пасёлак у Старынскім сельсавеце. Уваходзіў у Каменкаўскі сельсавет.

**КРАСНАЕ,** былы пасёлак у Старынскім сельсавеце. У 1926 г. 64 жыхары.

**КРАСНАЯ ЗАРА,** былы пасёлак у Гіжэнскім сельсавеце. У 1926 г. у Целяшоўскім сельсавеце, 19 жыхароў.

**КРАСНАЯ СЛАБАДА,** вёска ў Лапаціцкім сельсавеце. Мясцовая назва *Чырвоная Слабада*. На правым беразе р. Проня пры ўпадзенні яе ў Сож. Упершыню згадваецца ў 1856 г. і 1868 г. у метрыцы царквы Раства Багародзіцы. З гісторыі вядома, што былі слабоды *белыя*, *чорныя*, *чырвоныя*. Каля в. Красная Слабада цераз р. Проня ёсць брод, па якім, паводле падання, перапраўляўся Пётр І. У 1884 г. у Прапойскай воласці Быхаўскага павета, 33 двары, у тым ліку 1 кушнерскі, 1 сталярны і 1 бандарны, 165 жыхароў, хлебазапасны магазін. У 1910 г. 59 двароў, 404 жыхары. Адносілася да Рабавіцкага праваслаўнага прыхода. У 1912 г. існавала аднакласная царкоўнапрыходская школа, у 1918 г. — трохкласнае вучылішча. У 1926 г. у Рабавіцкім сельсавеце, 513 жыхароў, чатырохкласная школа. Іншая назва *Слабада*. Этнаграфічная асаблівасць: жанчыны вёскі насілі чырвоныя хусткі з белым ластам на лбе.

**КРАСНЫ ГАРАДЗЕЦ,** былы пасёлак у Гіжэнскім сельсавеце. У 1926 г. у Целяшоўскім сельсавеце, 34 жыхары.

**КРУГЛЫЯ ПАЛЯДКІ,** былы хутар у Кульшыцкім сельсавеце. Каля в. Серкаўка.

**КРУКОЎШЧЫНА,** частка маёнтка ў Кульшыцкім сельсавеце. На захад ад в. Кульшычы. Належала пану Крукоўскаму, зяцю кульшыцкага пана Ляснеўскага.

**КРУШЧУХАЎ,** былы хутар у Лапаціцкім сельсавеце. Каля в. Красная Слабада (Чырвоная Слабада).

**КРУШЫННІКІ,** былы пасёлак у Гіжэнскім сельсавеце. Назва паходзіць ад дрэва крушына (зараснікі — *крушыннікі*). У 1926 г. у Целяшоўскім сельсавеце, 46 жыхароў.

**КРЫВУЛІ,** былы пасёлак у Лапаціцкім сельсавеце. У 1926 г. у Іванішчавіцкім сельсавеце.

**КРЫНАЎГАЛ,** былы пасёлак у Кульшыцкім сельсавеце. Назва паходзіць ад слоў крын (крыніца) і гал (прагаліна сярод лесу, кустоў). У 1926 г. у Ржаўскім сельсавеце, 71 жыхар.

**КРЫНІЦЫ,** былы пасёлак у Свенскім сельсавеце каля в. Рэкта.

**КРЫНІЧКІ,** былы хутар у Кульшыцкім сельсавеце. Каля в. Ржаўка-1. У Крынічках жылі Кураленкі, Цуранковы, якія паходзілі з вёсак Чарнякоўка і Слаўня Свенскага сельсавета. У 1926 г. на хутары 55 жыхароў. Зліўся з в. Ржаўка-1.

**КРЫШАНОВА ЗАРАСЦЬ,** былы хутар у Васькавіцкім сельсавеце. Каля в. Шаламы-1. Назва паходзіць ад прозвішча ўладальнікаў Крышановых. Апошняе звязана з тым, што ў іх сям'і скрылікі бульбы і бульбяны суп называлі крышаны.

**КУЛІКОЎКА,** вёска ў Кульшыцкім сельсавеце. Паводле падання, назва вёскі паходзіць ад таго, што тут вялося мноства птушак кулікоў. У 1783 г. 33 двары, 341 жыхар. У 1865 г. належала двараніну Шаняўскаму, які меў 474 дзесяціны зямлі, карчму. У 1873 г. 147 жыхароў, у т.л. 66 яўрэяў-мужчын. У 1884 г. у Баханскай воласці Быхаўскага павета, 68 двароў, у тым ліку 3 кравецкія, 25 калёсных, 1 кавальскі, 356 жыхароў. У 1909 г. існавала Кулікоўскае сельскае таварыства. У 1926 г. дзейнічала чатырохкласная школа.

**КУЛІКОЎКА-1,** былая вёска ў Кульшыцкім сельсавеце. У 1910 г. у Баханскай воласці Быхаўскага павета, належала Кулікоўскаму 1-му сельскаму таварыству; 41 двор, 209 жыхароў. Адносілася да Баханскага праваслаўнага прыхода. У 1926 г. 306 жыхароў. Іншая назва *Кулікоўка Старая*.

**КУЛІКОЎКА-2,** вёска ў Кульшыцкім сельсавеце. У 1873 г. 173 жыхары. У 1910 г. належала Кулікоўскаму 2-му сельскаму таварыству; 52 двары, 384 жыхары. У 1926 г. 611 жыхароў. Іншая назва *Кулікоўка Новая*.

**КУЛЬШЫЧЫ,** вёска, цэнтр сельсавета. З 1864 г. належала Ляснеўскім, якія валодалі 851,5 дзесяцінай зямлі. У 1884 г. у Прапойскай воласці Быхаўскага павета; драўляная царква Раства Багародзіцы (пабудавана ў 1861), 2 цэнтральныя хлебазапасныя магазіны, 75 двароў, у тым ліку 1 кушнерскі, 1 кавальскі, 300 жыхароў, жыхары 10 былі ў адыходніцтве. У 1886 г. 56 двароў, 409 жыхароў, ветраны млын. У 1900 г. на сродкі Магілёўскага Богаяўленскага брацтва заснавана бібліятэка для пазашкольнага чытання. У 1910 г. належала Кульшыцкаму сельскаму таварыству, 127 двароў, 894 жыхары, трохкласнае царкоўнапрыходскае вучылішча (з 1911 — чатырохкласнае). У 1926 г. 675 жыхароў. Іншая назва *Кульшыцы* (1933).

**КУРБАЦКАЕ БАЛОТА,** былы хутар у Кульшыцкім сельсавеце. Належаў селяніну Аўдакіму Сладзюкову. Назва хутара паходзіць ад прозвішча Курбацкіх, якія жылі ў в. Урэчча.

**КУРГАНАЎКА,** вёска ў Слаўгарадскім гарсавеце. На правым беразе р. Сож. Назва паходзіць ад таго, што на полі было шмат старажытных курганоў радзімічаў. У 1926 г. пасёлак, 32 жыхары.

**КУРГАННЕ,** вёска ў Кульшыцкім сельсавеце. На левым беразе р. Пясчанка, насупраць в. Урэчча. Узнікла пасля адмены прыгону (1861). Мясцовыя жыхары гэта месца лічаць старажытным, паколькі тут шмат старажатных курганоў. У 1910 г. як хутар Крынічкі ў складзе Прапойскай воласці Быхаўскага павета, належаў Курганскаму сямідворнаму таварыству; 8 двароў, 36 жыхароў. Адносіўся да Кульшыцкага праваслаўнага прыхода. У 1926 г. 83 жыхары.

**ЛАБАНАЎШЧЫНА,** былы хутар у Свенскім сельсавеце. Поле каля в. Прудок. Назва, верагодна, паходзіць ад прозвішча пана.

**ЛАДЫМІРАВА,** былы хутар у Вась-

кавіцкім сельсавеце. На поўнач ад в. Шаламы-2. Мясцовыя назвы *Ладымірюва*, *Ладымірува* (ад Уладзімір).

**ЛАКІЗА,** былы хутар у Васькавіцкім сельсавеце. Каля в. Шаламы-2. Названы па мянушцы гаспадара, які прыехаў з-пад Гомеля.

**ЛАПАЦІЧЫ,** вёска, цэнтр сельсавета. У гістарычных крыніцах упамінаецца з 1847 г. Паводле падання, назва вёскі паходзіць ад прозвішча пана, які пасяліў тут людзей, а сам быў нібыта татарын. Пазней сюды перасяліліся жыхары з суседніх вёсак і хутароў.

У 1873 г. 219 жыхароў. У 1881 г. Лапацічы належалі пану Дзяржынскаму-Дзекцераву, які валодаў 377 дзесяцінамі зямлі. У 1884 г. у вёсцы 35 двароў, у тым ліку 1 кавальскі і 20 рамізніцкіх, 235 жыхароў, хлебазапасны магазін. У 1910 г. у Даўгамохскай воласці Быхаўскага павета, 58 двароў, 415 жыхароў. Адносілася да Рабавіцкага праваслаўнага прыхода.

**ЛАТЫШЫ,** група былых хутароў у Кульшыцкім сельсавеце. За вёскамі Хоцішча і Кульшычы. Латышы-перасяленцы з'явіліся тут у руска-японскую вайну 1904 — 1905 гг. Да Вялікай Айчыннай вайны латышы выехалі на радзіму.

**ЛЕБЯДЗЁЎКА,** вёска ў Свенскім сельсавеце. У 1884 г. у Баханскай воласці Быхаўскага павета, 31 двор, у тым ліку 1 кравецкі, 205 жыхароў, хлебазапасны магазін. У 1910 г. належала Лебядзёўскаму сельскаму таварыству, 37 двароў, 354 жыхары. Адносілася да Гайшынскага праваслаўнага прыхода. У 1912 г. існавала школа граматы.

У 1926 г. у Чарнякоўскім сельсавеце, 416 жыхароў, чатырохкласная школа. Іншыя назвы *Крывая Слабада*, *Крывая*.

**ЛЕНІНСКІ**, былы пасёлак у Васькавіцкім сельсавеце. Знаходзіўся на месцы маёнтка Новы Двор, ці Пад'ямнае, які належаў пану А.В.Каморскаму. Цяпер у калгасе «XVII партз'езд». Іншыя назвы *Плясна*, *Урэчча-2*, *Новы Двор*, *Пад'ямнае*.

**ЛЕНІНСКІ**, былы пасёлак у Гіжэнскім сельсавеце. Заснаваны ў 1926 г. у былым Целяшоўскім сельсавеце, 53 жыхары. Іншыя назвы *Трослійка*, *Траслійка*.

**ЛІПНІК,** былы пасёлак у Свенскім сельсавеце. Зліўся з в. Рэкта.

**ЛІЦЫН,** былы пасёлак у Гіжэнскім сельсавеце. У 1926 г. у Целяшоўскім сельсавеце, 39 жыхароў.

**ЛОКАЎКІ,** былы пасёлак у Свенскім сельсавеце. Зліўся з в. Рагі.

**ЛУК'ЯНАЎКА,** былы хутар у Гіжэнскім сельсавеце. У 1926 г. 17 жыхароў.

**ЛЫСАЯ ГАРА,** былы хутар у Кульшыцкім сельсавеце. Існаваў з 1911 г. каля в. Кульшычы.

**ЛЮБАНЫ,** вёска ў Гіжэнскім сельсавеце. У гістарычных крыніцах упамінаецца ў 1555 г. як сяло Любанавічы (у 1572 г. Любаны). Паводле мясцовага тлумачэння, назва вёскі паходзіць ад таго, што жыхары в. Любаны з'яўляліся не прыгоннымі, а казённымі сялянамі і паміж імі і панам была заключана «палюбоўная сказка». Вёска належала ротмістру Полацкага замка Васілю Маркавічу Няміру і пасля 1581 г.

У 1783 г. 33 двары, у 1873 г. карчма і 8 бабылёў. У 1910 г. у Лабанаўскай воласці Чэрыкаўскага павета, належала Лабанаўскаму сельскаму таварыству, 107 двароў, 726 жыхароў. Адносілася да Целяшоўскага праваслаўнага прыхода. У 1926 г. у Целяшоўскім сельсавеце, 651 жыхар, чатырохкласная школа. Вёска ўмоўна падзелена на 4 часткі (вуліцы): Узроўе, Дзярэўня, Рагаткі, Пасяродаўцы. У 1962 г. каля 150 двароў.

**ЛЮДКОЎ,** вёска ў Васькавіцкім сельсавеце. Паводле купчай 1874 г., уласнасць А.У.Бабылёва, які валодаў 2632 дзесяцінамі зямлі. У 1910 г. належала Людкоўскаму сельскаму таварыству, 23 двары, 194 жыхары. У 1926 г. у Гайшынскім сельсавеце, 217 жыхароў. Да 1928 г. называлася *Перадзел*.

**ЛЯСНАЯ,** вёска ў Лапаціцкім сельсавеце. Мясцовая назва *Лісная*. Вёска служыла прыгон пану Ціхнавецкаму. Паводле падання, у вёсцы было 72 душы мужчынскага полу. Землі тут пясчаныя, малаўрадлівыя, у выніку чаго ў час сталыпінскай аграрнай рэформы 1906 — 1917 гг. многа жыхароў перасялілася ў Сібір. У 1783 г. 30 двароў, 171 жыхар. У 1884 г. 41 двор, у тым ліку 2 сталярныя, 172 жыхары, хлебазапасны магазін. У 1910 г. у Прапойскай воласці Быхаўскага павета, каля р. Брадок, 61 двор, 403 жыхары. У 1912 г. адбылася ўрачыстасць з нагоды адкрыцця помніка і капліцы (былі закладзены ў 1908) на ўшанаванне памяці

«маці палтаўскай баталіі» — бітвы пад Лясной паміж рускімі і шведскімі войскамі (9.10.1708). У 1912 г. працавала аднакласная царкоўнапрыходская школа, у 1918 г. — трохкласнае вучылішча. У 1926 г. вёска ў Рабавіцкім сельсавеце, 563 жыхары. Да 1962 г. існавала чатырохкласная школа.

**ЛЯСНОЕ,** былы хутар у Лапаціцкім сельсавеце. Зліўся з в. Лясная. У 1926 г. 9 жыхароў.

**ЛЯЦЯГІ,** вёска ў Гіжэнскім сельсавеце. Мясцовыя назвы *Ліцягі*, *Лецягі*. Назва вёскі нібыта паходзіць ад назвы ляцягі сумчатай (заал. Petaurus), якая па-беларуску называецца *палятуха*, *лятунец*. У 1783 г. пабудавана драўляная Пакроўская царква; 31 двор, 145 жыхароў. З 1882 г. уладанне С.Шклярэвіча, які валодаў 1600 дзесяцінамі зямлі, 2 вадзянымі млынамі. У 1886 г. у Даўжанскай воласці Чэрыкаўскага павета, 27 двароў, 206 жыхароў, царква. У 1910 г. у Даўжанскай воласці Чэрыкаўскага павета, належала Ляцягскаму сельскаму таварыству, 51 двор, 389 жыхароў. У 1926 г. 542 жыхары, чатырохкласная школа.

**ЛЯЦЯГІ,** былы маёнтак у Гіжэнскім сельсавеце.

**МАКАЎЕ,** былы хутар у Васькавіцкім сельсавеце. У 1926 г. 9 жыхароў.

**МАЛАЦІЛАЎКА,** былы хутар у Кульшыцкім сельсавеце. На захад ад в.Кульшычы. Цяпер урочышча.

**МАЛАЦІЛКА,** былы пасёлак у Кульшыцкім сельсавеце. У 1926 г. у Ржаўскім сельсавеце, 55 жыхароў.

**МАЛАЯ АЛЕКСАНДРЫЯ,** былы хутар у Кульшыцкім сельсавеце. У 1926 г. у Ржаўскім сельсавеце, 12 жыхароў.

**МАЛАЯ СЛАБОДКА,** былы пасёлак у Слаўгарадскім гарсавеце. Зліўся са Слаўгарадам. Іншыя назвы *Бярозаўка*, *Новая Слабада*, *Слабада Бярозаўка*.

**МАЛЫ ПРУДОК,** былы фальварак у Свенскім сельсавеце.

**МАРГІ,** былы хутар у Кульшыцкім сельсавеце. У 1911 г. належаў селяніну Марозаву. Іншая назва *Марозаўка*.

**МАРОЗІНКА,** былая сядзіба (мыза) у Кульшыцкім сельсавеце. Каля в. Кульшычы (1854). Уласнасць паноў Леановічаў.

**МАРТЫНАЎКА,** былы хутар у Кульшыцкім сельсавеце. У 1910 г. належаў дваранiну Д.С.Вярбіцкаму і памешчыку Шаблоўскаму; 3 двары, 17 жыхароў. Адносіўся да Кульшыцкага праваслаўнага прыхода.

**МАСЦІШЧА,** былы пасёлак у Свенскім сельсавеце. Зліўся з в. Рэкта.

**МАШЧЭНКА,** былы пасёлак у Васькавіцкім сельсавеце. Мясцовая назва *Машчонка*. У 1926 г. 34 жыхары. Цяпер вуліца ў в. Чачораўка.

**МАШЭЦКАЯ СЛАБАДА,** вёска ў Лапаціцкім сельсавеце. Мясцовыя назвы *Машэцкыя Слабада*. У 1750 г. 10 двароў, называлася *Замашэцкая Слабада Новая*. У 1873 г. 58 рэвізскіх і 61 прышлы селянін. У 1910 г. вёска называлася *Слободка*. У 1926 г. у Іванішчавіцкім сельсавеце.

**МЕЛЬНІКАЎ,** былы выселак у Свенскім сельсавеце. У 1910 г. каля ручая Ракцянка, 4 двары, 39 жыхароў. Адносіўся да Ракцянскага праваслаўнага прыхода.

**МЕСНЫ,** былы пасёлак у Гіжэнскім сельсавеце. На левым беразе р. Гіжэнка. Назва паходзіць ад слоў *места* (горад), *мястэчка*. Да 1923 г. там жылі яўрэі, былі крамы, кузня. Аб пражыванні яўрэяў сведчыць урочышча Жыдоўскае Балотца. Цяпер адна з трох вуліц у в. Гіжэнка. Іншая назва *Месца*.

**МІХАЙЛАЎ,** былы фальварак у Васькавіцкім сельсавеце. Каля в. Шаламы-1. Вядомы з сярэдзіны XIX ст. У 1910 г. належаў дваранiну М.А.Ларанцэвічу (па-мясцоваму Варанцэвічу).

**МІХАЙЛАЎКА,** былы пасёлак у Лапаціцкім сельсавеце. На поўдзень ад в. Рабавічы. Вядомы з 1777 г. у Старабыхаўскай акрузе.

**МІХАЙЛОЎ,** былы фальварак у Слаўгарадскім гарсавеце. Мясцовая назва *Міхалоў*. У 1861 г. уладанне пана М.М.Ларанцэвіча.

**МІХАЛОВА,** былы фальварак у Васькавіцкім сельсавеце. Належаў дваранiну І.М.Ларанцэвічу, які ў 1861 г. валодаў 860 дзесяцінамі зямлі, вадзяным млынам на р. Пясчанка (прыносіў даходу 500 руб.), 2 карчмамі (у 1882 даход склаў 300 руб.). У 1910 г. 3 двары, 9 жыхароў. Адносіўся да Прапойскага праваслаўнага прыхода. Належаў дваранiну М.А.Ларанцэвічу. Іншае прозвішча *Шаламоўскі*.

**МІХАЛОВА-ПРАПОЙСКАЕ,** былы фальварак у Слаўгарадскім гарсавеце. Уласнасць дваранiна А.А.Мурамцава, які

ў 1871 г. валодаў 3 вадзянымі млынамі, карчмой, крамамі, броварам. Увесь прыбытак складаў 4100 руб. У 1882 г. яму належала 4913 дзесяцін зямлі. Іншая назва *Прапойск*.

**МІХАЛОЎ,** былая вёска ў Слаўгарадскім гарсавеце. На р. Сатунь (цяпер Цатуня). У 1910 г. уласнасць двараніна А.П.Мурамцава, 4 двары, 28 жыхароў. Адносілася да Прапойскага праваслаўнага прыхода. У 1926 г. тут быў пас. Міхайлова (Міхалова) з 50 жыхарамі. У панскім доме размяшчалася школа. Цяпер вуліца ў в. Чачораўка. Іншыя назвы *Міхалова-Прапойскае, Чачораўка, Прапойск, Цатуня*.

**МОЛАТАЎ,** былы пасёлак у Васькавіцкім сельсавеце. Узнік у 1939 – 1940 гг. з хутароў жыхароў в. Ржаўка. Перайменаваны ў в. Ржаўка-2.

**МУРАНДОЎШЧЫНА,** былы хутар у Кульшыцкім сельсавеце. У 1910 г. у Прапойскай валасці, належаў мяшчанам Няфёдаву і Х.Канстанцінаву; 3 двары, 15 жыхароў. Адносіўся да Кульшыцкага праваслаўнага прыхода. Іншая назва *Мурачоўшчына*.

**МУРЗІНКА**, былы маёнтак у Кульшыцкім сельсавеце. Уласнасць дваран Леановічаў (6 чал.), якія ў 1879 г. валодалі 625 дзесяцінамі зямлі. У 1908 г. існавала Мурзінскае сельскае таварыства. Цяпер урочышча.

**МУРЗЫКАЎКА,** былы фальварак у Кульшыцкім сельсавеце. На ўсход ад в. Кульшычы. Вядомы з 1850 г.

**МЯЎНОЕ БАЛОТА,** былы фальварак у Старынскім сельсавеце. Цяпер в. Дабранка.

**НАВІНА,** былы пасёлак у Гіжэнскім сельсавеце. У гістарычных крыніцах згадваецца ў 1858 г. у складзе маёнтка Прапойск. У 1926 г. у Целяшоўскім сельсавеце, 28 жыхароў. Цяпер назва вуліцы ў в. Трасліўка. Іншыя назвы *Усход, Панская, Навіны*.

**НАВІНКА,** былы пасёлак у Гіжэнскім сельсавеце. У 1926 г. у Целяшоўскім сельсавеце, 17 жыхароў.

**НАПРЭІХА,** былы хутар у Васькавіцкім сельсавеце. Каля в. Шаламы-2. Належаў удаве Напрэя (Анупрэй ад Ануфрый).

**НАЧАЛА,** былы пасёлак у Васькавіцкім сельсавеце. У 1926 г. 67 жыхароў.

**НІКАНОРАВА,** былы хутар у Васькавіцкім сельсавеце. На ўсходзе ад в. Шаламы-1. Належаў селяніну Ніканору Шаўцову. Нетры хутара багаты гравіем. Адсюль другая назва хутара *Ніканорынкава Гара*. На месцы хутара знаходзяцца залежы якаснай чырвонай гліны, з якой рабілі цэглу, кафлю. Адсюль гліну нават вазілі ў Прапойск на кафельны завод. Кафлю дастаўлялі ў Маскву для абкладання сцен Крамля і іншых пабудоў. Іншая назва *Ніканорынкава Гара*.

**НІКОЛЬСКІ,** былы пасёлак у Гіжэнскім сельсавеце. У 1926 г. 49 жыхароў.

**НОВА-КРАСНЫ,** былы пасёлак у Лапаціцкім сельсавеце. У 1926 г. у Рабавіцкім сельсавеце, 38 жыхароў.

**НОВАЯ ВАЛЫНЬ,** былы хутар у Васькавіцкім сельсавеце. Каля в. Шаламы-1. З 1909 г. па 1914 г. тут жылі на зямлі пана Ларанцэвіча перасяленцы (якіх запрасіла пані) з Хацячаўскай воласці Валынскай губерні. У 1914 г. яны выехалі на радзіму. Іншыя назвы *Валынь, Валынец, Казелец*.

**НОВАЯ КАМЕНКА,** вёска ў Каменкаўскім сельсавеце. Назва ўзнікла, відаць, у сярэдзіне XIX ст. У 1892 г. у Старынскай воласці Чэрыкаўскага павета, належала Навакаменскаму сельскаму таварыству; 19 двароў, 207 жыхароў. Адносілася да Папараткаўскага праваслаўнага прыхода. Іншыя назвы *Каменка, Прудзішча*.

**НОВАЯ СЛАБАДА,** былая вёска ў Слаўгарадскім гарсавеце. На правым беразе р. Проня. У 1873 г. 52 рэвізскія душы і 74 прышлыя. У 1884 г. у Прапойскай воласці Быхаўскага павета, 27 двароў, у тым ліку 4 рамізніцкія, 108 жыхароў, хлебазапасны магазін. У 1910 г. належала Новаслабодскаму сельскаму таварыству, 51 двор, 354 жыхары. У 1926 г. 536 жыхароў, чатырохкласная школа. Іншыя назвы *Слабада, Бярозаўка, Слабада Бярозаўка*. Апошняя назва звязана з часам высаджвання (1773 – 1777) бяроз паабапал бальшака. Цяпер вёска амаль злілася са Слаўгарадам.

**НОВЫ ДВОР,** былы фальварак у Кульшыцкім сельсавеце. Уласнасць двараніна Каморскага, які ў 1882 г. валодаў 212 дзесяцінамі зямлі. Іншыя назвы *Пад'ямкі, Ленінскі, Урэчча-2*.

**НОВЫ ДВОР,** былы фальварак у Васькавіцкім сельсавеце. У 1910 г. нале-

жаў двараніну І.А.Каморскаму; 2 двары, 11 жыхароў. Адносіўся да Журавіцкага рымска-каталіцкага прыхода. Іншая назва *Пад'ямнае*.

**НЯКРАСАВА,** былы пасёлак у Слаўгарадскім гарсавеце. У 1926 г. 12 жыхароў.

**НЯМІЛЬНЯ,** былая вёска ў Старынскім сельсавеце. Мясцовыя назвы *Нямілна, Нямілiна, Нямiлня*. У гістарычных крыніцах упамінаецца з 1750 г. (15 двароў). У 1910 г. у Старынскай воласці Чэрыкаўскага павета, належала Нямілінскаму сельскаму таварыству; 23 двары, 204 жыхары. Адносіліся да Старынскага праваслаўнага прыхода. У 1926 г. 349 жыхароў.

**ПАГАРЭЛАЕ,** былая вёска ў Васькавіцкім сельсавеце. На ўсход ад в. Ганчароўка, на правым беразе р. Плясна. Там жылі сяляне з в. Васькавічы: Бутравы, Мажэевы (яны ж Папковы), Мельнікавы (яны ж Любенькія). Зямля ва ўрочышчы Пагарэлае належала Л.А.Мельянцову, які сам жыў на хутары Ганчароўка. У 1961 г. жыхары перасяліліся ў в. Ганчароўка. Іншая назва *Прасвет*.

**ПАДАЗЕР'Е,** былая вёска ў Васькавіцкім сельсавеце. Каля в. Шаламы-1. Назва паходзіць ад месцазнаходжання Падазер'я на правым беразе былога старажытнага стаўка на летапіснай р. Пішчань (Пясчанка). Паводле сведчанняў старажылаў, в. Падазер'е засялялася асобна ад в. Шаламы-1, мела сваю зямлю. Успамінаюць, што засяленне ішло з-за Сажа. У сярэдзіне XVIII ст. 10 двароў, 59 жыхароў. Паводле рэвізіі 1772 г., 54 жыхары (беглых 4 чал.). У 1873 г. у в. Шаламы разам з Падазер'ем 153 рэвізскія і 181 прышлы селяніны. У 1909 г. у в. Падазер'е 48 домаўласнікаў. У 1910 г. належала Шаламоўскаму сельскаму таварыству, 57 двароў, 340 жыхароў. Верагодна, у 1909 г. Шаламоўскае таварыства раздзялілася на дзве часткі. Сельскі староста быў адзін. У 1961 г. 30 хат. Цяпер назва вуліцы ў в. Шаламы-1. Іншыя назвы *Слабада, Зарэцкая Слабада, Падазерская Слабада, Навазер'е*.

**ПАДБОР'Е,** былы пасёлак у Васькавіцкім сельсавеце. У 1926 г. 20 жыхароў.

**ПАДГУР'Е,** былы маёнтак (1912) у Гіжэнскім сельсавеце. Каля в. Усохі.

**ПАДСПОРЫ,** былы пасёлак у Васькавіцкім сельсавеце. У 1926 г. 38 жыхароў.

**ПАЛОЯЎ,** былы пасёлак у Гіжэнскім сельсавеце. У 1926 г. у Целяшоўскім сельсавеце, 51 жыхар. Іншыя назвы *Пароеўка, Бязуеўка, Палой, Палоева*.

**ПАНСКІ ДВОР ЧАРАНКОЎ,** былая сядзіба ў Лапаціцкім сельсавеце. Згадваецца ў гістарычных крыніцах з 1786 г. (паміж вёскамі Узгорск, Доўгі Мох і Боўкі).

**ПАПОЎКА,** вёска ў Васькавіцкім сельсавеце. Паводле архіўных матэрыялаў, належала Прапойску, цэрквам Раства Багародзіцы і Міколы Цудатворцы. Мела 150 дзесяцін, 62 жыхары. Мясцовыя старажылы сведчылі, што ў 1796 г. у Папоўцы было 9 двароў. У 1851 г. праз вёску была пракладзена частка шашы Масква — Варшава. У 1873 г. 53 рэвізскія і 68 прышлых душ. У 1884 г. 26 двароў (1 двор вырабляў драўляны посуд), 106 жыхароў, жыхары 2 двароў былі ў адыходніцтве, хлебазапасны магазін. У 1910 г. належала Папоўскаму сельскаму таварыству, 27 двароў, 209 жыхароў. Адносілася да Прапойскага праваслаўнага прыхода. У 1926 г. 245 жыхароў.

**ПАСТАЯЛЫ ДВОР,** былы хутар у Васькавіцкім сельсавеце. У 1926 г. 7 жыхароў.

**ПАЦЭЯ,** былы хутар у Свенскім сельсавеце. Назва паходзіць ад прозвішча Пацей. У 1910 г. у Баханскай воласці Быхаўскага павета, належаў мешчаніну Рэпіну; 1 двор, 7 жыхароў. Адносіўся да Гайшынскага праваслаўнага прыхода. У 1926 г. у Чарнякоўскім сельсавеце, 4 жыхары.

**ПАЦЯРАЕЎКА,** вёска ў Лапаціцкім сельсавеце. Паводле падання, у в. Пацяраеўка было калісьці толькі 3 двары. Вядома, што назва вёскі ўпамінаецца ў 1708 г. у паперах Пятра І. Паданне ж сведчыць, што Пётр І згубіў свой кішэнны гадзіннік на ланцужку на тым месцы, дзе цяпер в. Пацяраеўка. Ён вярнуўся, пашукаў, але не знайшоў і паехаў назад. Пад'язджаючы да в. Чыкаўка, пачуў ціканне гадзінніка: «чычы-чы», «чык-чык-чык» (адсюль і назва суседняй в. Чыкаўка). На карце 1777 г. адзначана разам з вадзяным млынам. У 1873 г. 98 рэвізскіх і 117 прышлых душ, у 1877 г. пабудавана мураваная Троіцкая царква. У 1910 г. у Даўгамохскай воласці Быхаўскага павета, каля р. Раста, 69 двароў, 483 жыхары. Адносілася да Даўга-

мохскага праваслаўнага прыхода. У 1926 г. 485 жыхароў.

**ПЕРАГОН,** былы хутар у Васькавіцкім сельсавеце. У гістарычных крыніцах упамінаецца ў 1776 г. У 1910 г. належаў Перагонскаму сельскаму таварыству, 11 двароў, 58 жыхароў. Адносіўся да Гайшынскага праваслаўнага прыхода. У 1926 г. у Гайшынскім сельсавеце, 113 жыхароў.

**ПЕРАГОН,** вёска ў Свенскім сельсавеце. Жыхары вёскі былі прыгонныя, якіх, паводле падання, сюды перасялілі, пераганаў жыць пан. На карце 1777 г. пазначана разам з вадзяным млынам. У 1884 г. 70 двароў, 546 жыхароў, заезны дом. У 1906 г. разам з вёскамі Прудок, Слаўня, Чарнякоўка ўваходзіла ў Слаўнянскае таварыства сялян — уладанне пана Лаўрыненкі. У 1910 г. у Бычанскай воласці Быхаўскага павета, каля р. Перагонка, належала Перагонскаму сельскаму таварыству; 113 двароў, 792 жыхары. Адносілася да Ракцянскага праваслаўнага прыхода. У 1926 г. 113 жыхароў.

**ПЕРАГОНСКІ ПРУДОК,** былы хутар у Свенскім сельсавеце. У 1910 г. належаў Перагонска-Прудоцкаму сельскаму таварыству; 1 двор, 7 жыхароў. Адносіўся да Ракцянскага праваслаўнага прыхода.

**ПЕРАКАТ,** былы пасёлак у Васькавіцкім сельсавеце. У 1926 г. 94 жыхары.

**ПЕРАТОРГ,** былы хутар у Кульшыцкім сельсавеце. Каля в. Кульшычы. Цяпер урочышча.

**ПЕРЦАВА,** былы хутар у Васькавіцкім сельсавеце. На поўнач ад в. Шаламы-1. Назва паходзіць ад мянушкі гаспадара.

**ПЛЯСНА,** былы фальварак у Васькавіцкім сельсавеце. На думку старажылаў, назва звязана з плесняй-раскай, якая летам зацягвае ваду р. Пляснянка. Адносіўся да Журавіцкага рымска-каталіцкага прыхода. Іншыя назвы *Ленінскі*, *Урэчча П.Яўстажына*.

**ПЛЯСНА,** былы маёнтак у Васькавіцкім і Ржаўскім сельсаветах. У 1855 г. быў пад апекай паноў Казіміра і Цітуса Каморскіх над малалетнімі Каморскімі.

**ПЛЯСНО,** былы фальварак у Васькавіцкім сельсавеце. Належаў дваранам Каморскім. У 1882 г. 684 дзесяціны зямлі. У 1910 г. 2 двары, 13 жыхароў. Адносіўся да Журавіцкага рымска-каталіцкага прыхода. У 1926 г. пасёлак, 15 жыхароў.

**ПРАГУЛЯНКА,** былы пасёлак у Кульшыцкім сельсавеце. У 1926 г. у Ржаўскім сельсавеце, 39 жыхароў.

**ПРАПОЙСК,** да 1945 г. гарадскі пасёлак, цэнтр Слаўгарадскага раёна. Упершыню згадваецца пад назвай *Прупой* (*Пропой*) ва Устаўнай грамаце 1136 г. смаленскага князя Расціслава Мсціслававіча. У пазнейшых гістарычных крыніцах вядомы пад назвамі Прупойск, Прапоськ, Прапуйск, Прапышеск і інш. Паводле дакументаў і народнага падання, назва Прапойск паходзіць ад назвы р. Проня (у старажытнасці *Пропость*, г. зн. рака, на якой шмат віроў і плывучых наносаў, і таму тут заўсёды была пропасць, пагібель ворагам). Іншае паданне сведчыць, што назва Прапойск звязваецца са значэннем «пропуск», г.зн. брод на *Проні*, перад *Прапойскам*, каля в. Красная Слабада і ніжэй *Прапойска*, на Сажы, каля в. Гайшын Слаўгарадскага раёна і в. Глінка Кармянскага раёна. Цераз гэтыя брады ў час войнаў перапраўляліся войскі. І ў гэтым паданні паходжанне назвы Прапойск таксама звязваецца з р. Проня — Пропасць. Прапойск уваходзіў у склад Смаленскага княства. З 1350-х гадоў у Вялікім княстве Літоўскім, дзяржаўнае ўладанне ў складзе т.зв. Падняпроўскіх валасцей. У 1675 г. 58 дымоў, якія плацілі чынш 373 злотыя 13 грошаў. У 1681 г. адзначана вуліца з Рынку над ровам, у 1750 г. — Школьны пляц (плошча), 100 двароў. З 1774 г. уладанне А.М.Галіцына, потым памешчыкаў Бенкендорфа, Дз.Янчына, Мурамцавай, Коратцава. У канцы XVIII ст. было 11 корчмаў. У канцы XVIII-XIX ст. дзейнічалі Мікалаеўская, Георгіеўская, Раства Багародзіцы (пабудавана ў 1793), Свята-Андрэеўская цэрквы. З 1848 г. у мястэчку размяшчалася кантора Канцыляры і па ўпарадкаванні Маскоўска-Варшаўскай шашы. У 1897 г. 1000 жыхароў. У 1902 г. у Старабыхаўскім павеце, 182 двары, 1499 жыхароў, 2 царквы, сінагога, 2 яўрэйскія маліто ўныя дамы, паштовая кантора. У 1927 г. 4244 жыхары, кафельная і канатная фабрыкі. З 1945 г. афіцыйная назва Слаўгарад. У 1965 г. 7 тыс. жыхароў.

**ПРАПОЙСК,** былы фальварак у Слаўгарадскім гарсавеце. Уладанне (з 1871) дваранiна А.А.Мурамцава, якому належалі 3 вадзяныя млыны, карчма, лаўкі, вінакурны завод. Прыбытак складаў 4100

рублёў. У 1882 г. ён валодаў 4913 дзесяцінамі зямлі. Іншыя назвы *Прапойск, Слаўгарад, Кастрычнік, Міхалова Прапойскае.*

**ПРОХАРАЎКА**, былы хутар у Гіжэнскім сельсавеце. У 1926 г. у Целяшоўскім сельсавеце, 8 жыхароў.

**ПРУДОК,** вёска ў Свенскім сельсавеце. Назва звязана з існаваннем тут стаўка (прудка). Яшчэ і цяпер сустракаюцца палі ад стаўка, а таксама дзікія камяні (жорны). Малолі дзікаром, г.зн. дзікімі, прыроднымі, а не літымі камянямі.

Да Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. многа жыхароў выехалі ад беззямелля ў Сібір, напрыклад, у былую Енісейскую губерню. Жыхары в. Прудок, відаць, паходзяць з суседняй в. Рагі. Аб гэтым сведчыць надпіс на карце 1777 г. — Прудок Рагожскі, дзе былі запруда і млын на р. Козел. У 1884 г. у Баханскай воласці Быхаўскага павета, 71 двор, у тым ліку 1 кравецкі, 1 калёсны, 462 жыхары, жыхары 5 двароў у адыходніцтве, хлебазапасны магазін. У 1910 г. належала Прудоцкаму сельскаму таварыству, 115 двароў, 856 жыхароў. Адносілася да Ракцянскага праваслаўнага прыхода. Іншыя назвы *Рогаўскі Прудок, Рагаўскі Прудок, Рагінскі Прудок, Прудок Рагожскі.*

**ПРУДОК,** былы маёнтак у Свенскім сельсавеце. У 1908 г. у Быхаўскім павеце Магілёўскай губерні, уладанне Лаўрыненкі. Існавала Слаўнянскае таварыства сялян (вёскі Прудок, Перагон, Слаўня, Чарнякоўка).

**ПРЫВОЛЛЕ,** вёска ў Кульшыцкім сельсавеце. Паводле сведчання старажылаў, назва вёскі адлюстроўвае тут прыдатнае месца, *прыўдобу*, прыволле селяніну. Верагодна людзі сюды перасяліліся з в. Дарагунск, ці Драгунск, Журавіцкага сельсавета Рагачоўскага раёна, з Паляўшчыны. Вядома з 1855 г. У 1884 г. у Прапойскай воласці Быхаўскага павета, хлебазапасны магазін. У 1910 г. належала Прывольскаму сельскаму таварыству, 35 двароў, 218 жыхароў. Адносілася да Кульшыцкага праваслаўнага прыхода. У 1926 г. 298 жыхароў.

**ПЧЭЛЬНЯ,** вёска ў Кульшыцкім сельсавеце. Узнікла пасля адмены прыгону (1861). Назва звязана з тым, што мясцовасць тут вельмі прыдатная для пчаліных пасек. Іншая назва *Завад.*

**РАБАВІЧЫ,** вёска ў Лапаціцкім сельсавеце. У 1560 г. назва вёскі адзначаецца ў інвентары Дубровенскім пры апісанні ўладанняў, угоддзяў і сенажацей с. Цёплае (суседні Чавускі раён). На карце 1777 г. Рабавічы ў Старабыхаўскай акрузе, вадзяны млын, паштовая станцыя. У 1831 г. пабудавана драўляная Пакроўская царква. У 1873 г. 115 рэвізскіх і 139 прышлых людзей. У 1886 г. у Прапойскай воласці, каля возера Чыстая Лужа, 44 двары, 264 жыхары, Пакроўская царква, заезны дом, млын. У 1910 г. 76 двароў, 542 жыхары, бібліятэка для пазашкольнага чытання ў царкоўнапрыходскай школе. У 1926 г. 794 жыхары, чатырохкласная школа. Іншая назва *Рабавіцкая Слабада, Рабавіча.*

**РАБІНАЎКА,** вёска ў Кульшыцкім сельсавеце. Паданне пра паходжанне назвы вёскі сведчыць, што паблізу могілак была крынічка, а каля яе раслі тры рабіны — гэта і стала назвай для паселішча. Першымі жыхарамі былі рабочыя, якія тут часалі клёпкі з дубу і асіны. Вёска належала Галіцыным. Першае ўпамінанне ў дакументах адносіцца да канца XVIII ст.

17 двароў, 114 жыхароў. У 1873 г. у Прапойскай воласці Быхаўскага павета, 73 рэвізскія і 102 прышлыя селяніны. У 1884 г. 42 двары, 146 жыхароў, жыхары 3 двароў у адыходніцтве. У 1905 г. каля в. Рабінаўка быў маёнтак пана Л.М.Каморскага. У 1918 г. існавала трохкласнае вучылішча. У 1926 г. 748 жыхароў, чатырохкласная школа. У 1961 г. працавала сямігодка.

**РАГАЛЁВА,** былы хутар у Васькавіцкім сельсавеце. Паводле падання, назва паходзіць ад паведамлення селяніна Гербалева пану, што ён бачыў у лесе рагаля (лася). Зліўся з в. Шаламы-1. Іншая назва *Рагалькова, Рагаль, Рагалёў.*

**РАГІ,** вёска ў Свенскім сельсавеце. Назва вёскі паходзіць ад формы вясковых палявых абшараў у выглядзе рога. Сяляне купілі зямлю ў Навабыхаўскім графстве ў свенскага пана ў 1750 г. па тры рублі за дзесяціну. Жыхары з'яўляюцца выхадцамі з суседняй в. Лебядзёўка. У 1783 г. вёска належала князю Галіцыну і складалася з дзвюх частак: Малыя Рагі і Вялікія Рагі. Малыя Рагі мелі 38 двароў, 248 жыхароў, Вялікія Рагі — 85 двароў, 524 жыхары. У 1884 г. у в. Рагі 103 двары, у тым ліку 8 кравецкіх і 1 кавальскі, 590

жыхароў, жыхары 2 двароў былі ў адыходніцтве, хлебазапасны магазін, ветраны млын, карчма. У 1910 г. у Баханскай воласці Быхаўскага павета, належала Рагоўскаму сельскаму таварыству, 140 двароў, 789 жыхароў. Адносілася да Баханскага праваслаўнага прыхода. У 1912 г. аднакласная школа. У 1933 г. у Прудоцкім сельсавеце.

**РАГОЖНАЕ,** былы хутар у Свенскім сельсавеце. Знаходзіўся недалёка ад в. Лебядзёўка і былога пас. Бялёва. У 1910 г. у Баханскай воласці Быхаўскага павета, 6 двароў, 48 жыхароў. Адносіўся да Гайшынскага праваслаўнага прыхода. У 1926 г. у Чарнякоўскім сельсавеце, 58 жыхароў.

**РАГОЖНАЕ,** былы хутар у Кульшыцкім сельсавеце. Каля вёсак Серкаўка і Ржаўка.

**РАГОЗНАЕ,** былы хутар у Кульшыцкім сельсавеце. Каля в. Прыволле і хутара Крынічкі. Тут жылі Шубадзёравы. Паводле купчай 1868 г., уласнасць селяніна — Яўхіма Андрэева, які ў 1882 г. меў 136 дзесяцін зямлі. У 1910 г. у Прапойскай воласці Быхаўскага павета, належаў мешчаніну Л.Краснячэнку (адсюль іншыя назвы *Краснячонкі*, *Краснячонкава*); 5 двароў, 25 жыхароў. Адносіўся да Гайшынскага праваслаўнага прыхода. У 1926 г. у Ржаўскім сельсавеце, 29 жыхароў.

**РАЗКІ,** вёска ў Свенскім сельсавеце. Каля в. Прудок, па дарозе ў в. Рагі. Назва паходзіць ад слова *рэзаць*. Пасля адмены прыгону (1861) былі зроблены *прырэзкі* да зямлі в. Прудок.

**РАМАНАЎКА,** былы хутар у Васькавіцкім сельсавеце. Каля в. Папоўка.

**РАМАНЧЫКАВА,** былы хутар у Васькавіцкім сельсавеце. Каля в. Шаламы-1, у напрамку в. Кабіна Гара. Назва ад прозвішча ўладальнікаў — Раманчыкаў. Іншая назва *Раманчыкі*.

**РЖАЎКА-1,** вёска ў Кульшыцкім сельсавеце. Мясцовыя назвы *Аржаўка*, *Ржаўвака*, *Іржаўка*, *Ржаўка Старая*. Старажылы сведчылі, што вёска была ўжо да прыгону, назву атрымала ад балоцістай мясцовасці — *іржавая вада*. Паводле другога падання, в. Ржаўка перад адменай прыгоннага права (1861) называлася *Луб-Камочышча (Лубкамочышча), бо тут было многа ліпніку, з якога дралі лубкі (луб), кару мачылі і з валокнаў ткалі рагожу, рабілі мачулу (мачала), рашоты*. З 1774 г. уласнасць князя Галіцына, 160 жыхароў; у 1783 г. 53 двары, 185 жыхароў. У 1873 г. 139 рэвізскіх і 163 прышлыя селяніны. У 1884 г. 64 двары, 280 жыхароў, жыхары 4 двароў у адыходніцтве, хлебазапасны магазін. У 1906 г. каля в. Ржаўка знойдзены скарб колькасцю 125 сярэбраных пражскіх грошаў. У 1910 г. в. Ржаўка каля бальшака і р. Паплавы, належала Ржаўскаму сельскаму таварыству (у 1912 – 108 домаўласнікаў), 121 двор, 770 жыхароў. Адносілася да Кульшыцкага праваслаўнага прыхода. У 1918 г. трохкласнае вучылішча. У 1926 г. 994 жыхары, чатырохкласная школа.

**РАПНІНО,** былы хутар у Свенскім сельсавеце. У 1926 г. у Чарнякоўскім сельсавеце, 7 жыхароў. Іншая назва *Рэпніна*.

**РУДНЯ,** былы хутар у Кульшыцкім сельсавеце. Каля в. Кульшычы. Вядомы з 1911 г.

**РУДНЯ,** вёска ў Гіжэнскім сельсавеце. Уваходзіла ў былы Целяшоўскі сельсавет.

У XIX ст. вядома як фальварак Рудня. Паводле купчай 1867 г., належала камусьці Шклярэвічу. Знаходзілася каля в. Ляцягі. У 1910 г. хутар Рудня ў Даўжанскай воласці Чэрыкаўскага павета, уладанне двараніна Нянькоўскага-Вайніловіча, 44 двары, 318 жыхароў. Адносіўся да Ляцягаўскага праваслаўнага прыхода. Іншая назва *Грамыкі*.

**РУДНЯ,** вёска ў Васькавіцкім сельсавеце. На р. Пясчанка, частка якой называецца тут Рудніца. Назву вёска атрымала ад існавання на стаўку Руднянскі доменнай печы, дзе выплаўлялі жалеза з балотнай руды. З XVIII ст. адзначаецца на картах. У 1750 г. 9 двароў. Паводле рэвізіі 1772 г., 89 жыхароў (беглых 11 чал.). У 1873 г. 130 рэвізскіх і 155 прышлых душ. У 1884 г. 65 двароў, у тым ліку 2 кравецкія, 1 кавальскі і 7 рамізніцкіх, 260 жыхароў, хлебазапасны магазін. У 1910 г. 75 двароў, 582 жыхары. Адносілася да Прапойскага праваслаўнага прыхода.

**РУЧАЕЎ,** былы хутар у Лапаціцкім сельсавеце. Каля в. Красная Слабада (Чырвоная Слабада).

**РЭКТА,** вёска ў Свенскім сельсавеце. Узнікла ў сярэдзіне XIX ст. для абслугоўвання ўчастка шашы Масква – Варшава. У 1862 г. у вёсцы пабудавана драўляная

царква Раства Багародзіцы. У 1873 г. 283 рэвізскія і 343 прышлыя селяніны. З 1874 г. належала Мінюшскаму, які ў 1882 г. валодаў 561 дзесяцінай зямлі, 2 вадзянымі млынамі і карчмой. У 1884 г. у Бычанскай воласці Быхаўскага павета, меўся хлебазапасны магазін. У 1886 г. 104 двары, 771 жыхар, 3 ветракі, яўрэйскі малітоўны дом. У 1900 г. была царкоўнапрыходская школа, пры ёй заснавана бібліятэка для пазашкольнага чытання. У 1910 г. належала Ракцянскаму сельскаму таварыству, 155 двароў, 1115 жыхароў. Адносілася да Ракцянскага праваслаўнага прыхода. У 1912 г. існавала царкоўнапрыходскае вучылішча.

**РЭКТА,** былы фальварак у Свенскім сельсавеце. Вядомы з 1849 г.

**РЭКТА-БЫЧ,** былая вёска ў Свенскім сельсавеце. Вядома з 1884 г.

**РЭКТА-МІХАЙЛАЎКА,** былыя выселкі ў Свенскім сельсавеце. У 1910 г. на р. Перагонка, 20 двароў, 132 жыхары. Адносіліся да Ракцянскага праваслаўнага прыхода.

**РЭКТА СЛАБАДА,** былая вёска ў Свенскім сельсавеце. У гістарычных крыніцах упамінаецца каля 1600 г. Уваходзіла ў Прапойскую воласць.

**САДЫКІН,** былы хутар у Кульшыцкім сельсавеце. Мясцовыя назвы *Садыкіна*, *Садыкіны*. Назва паходзіць ад старажытнага імя Садок, Садыка, Садко. У 1910 г. у Прапойскай воласці Быхаўскага павета, належаў селяніну Н.Андрыянаву і мешчаніну А.Галенку, 3 двары, 14 жыхароў. Адносіўся да Прапойскага праваслаўнага прыхода.

**САДЫКІНА,** былы хутар у Кульшыцкім сельсавеце. Назва паходзіць ад старажытнага імя Садок, Садко, Садыка. У 1873 г. у Прапойскай воласці Быхаўскага павета, 8 жыхароў. У 1926 г. у Ржаўскім сельсавеце, 34 жыхары. Іншыя назвы *Садыкін*, *Садыкіны*.

**САМСОНАЎКА,** былы пасёлак у Васькавіцкім сельсавеце. Назва паходзіць ад імя Самсон. У 1926 г. 137 жыхароў.

**САПЕЛЬ,** былы хутар у Кульшыцкім сельсавеце. У 1910 г. належаў селяніну Н.Осінаву, 1 двор, 9 жыхароў. Адносіўся да Кульшыцкага праваслаўнага прыхода. Іншая назва *Саплі*.

**САЎКІ,** былы пасёлак у Кульшыцкім сельсавеце. У 1926 г. у Ржаўскім сельсавеце, 13 жыхароў.

**СВЕНСКАПОЛЛЕ,** былы маёнтак у Свенскім сельсавеце. У 1870 г. уладанне двараніна Я.Р.Корнрумпфа, які валодаў тут 1800 дзесяцінамі зямлі (1882). У 1910 г. маёнтак у Бычанскай воласці Быхаўскага павета, каля Маскоўска-Варшаўскай шашы, належаў Эйхельману; 4 двары, 16 жыхароў. Адносіўся да Ракцянскага праваслаўнага прыхода. У 1926 г. хутар Свенскаполле ў Чарнякоўскім сельсавеце, 41 жыхар.

**СВЕНСКАПОЛЛЕ,** былы хутар у Свенскім сельсавеце. У 1910 г. належаў дваранцы Бадзеўскай і мешчаніну Лабанаву, 1 двор, 5 жыхароў. Іншая назва *Пералесянкі*.

**СВЕНЦКАПОЛЬ,** былы фальварак ў Свенскім сельсавеце. Вядомы з сярэдзіны XIX ст.

**СЕЛІШЧА,** вёска ў Васькавіцкім сельсавеце. Мясцовая назва *Селішчы*. Каля в. Гайшын. У 1910 г. хутар Селішчы ў Прапойскай воласці Быхаўскага павета, на р. Ульянка, належаў сялянам К.Дарафееву, А.Мацвееву і І.Емяльянаву. Адносіўся да Гайшынскага праваслаўнага прыхода, 4 двары, 20 жыхароў. У 1926 г. у Гайшынскім сельсавеце, 64 жыхары.

**СЕЛІШЧА,** былы хутар у Кульшыцкім сельсавеце. Каля в. Кульшычы. У 1926 г. 41 жыхар.

**СЕРКАЎКА,** вёска ў Кульшыцкім сельсавеце. Узнікла ў 1889 г. на зямлі (210 дзесяцін) стацкага саветніка Баніна. Назва паходзіць ад колеру серай, падзолістай зямлі на ўсёй пpасторы серкаўскіх палёў. Першымі насельнікамі былі сяляне з вёсак Урэчча і Шаламы. У 1910 г. у Прапойскай воласці Быхаўскага павета. Належала сельскаму таварыству, 9 двароў, 59 жыхароў. Адносілася да Кульшыцкага праваслаўнага прыхода. Іншыя назвы *Азершчына*, *Пужоў*, *Сяркоўка*, *Клімы*.

**СІЛІНА ПОЛЕ,** вёска ў Слаўгарадскім гарсавеце. Каля шашы Масква — Варшава, на левым беразе р. Сож. У 1882 г. сяляне П.Я. і А.Я.Гракавы валодалі тут 168 дзесяцінамі зямлі. У 1910 г. хутар Сіліна Поле належаў мешчаніну Варанцу, 2 двары, 13 жыхароў. Адносіўся да Язёрскага праваслаўнага прыхода. У 1926 г. у пасёлку Сіліна Поле Гіжэнскага сельсавета 38 жыхароў. Іншыя назвы *Гракі*, *Сілінполле*.

**СІТНІКІ,** былы пасёлак у Свенскім сельсавеце. Каля в. Чарнякоўка. У 1926 г. 9 жыхароў.

**СКАЎПЕШКАЎ ХУТАР,** былы хутар у Гіжэнскім сельсавеце. Каля в. Гіжэнка. Назва паходзіць ад прозвішча уладальніка.

**СКРЫП'Е,** былы пасёлак у Гіжэнскім сельсавеце. Назва паходзіць, верагодна, ад нараста (грыба) на дубовым карэнні — скрыпнік. У 1926 г. у Целяшоўскім сельсавеце, 16 жыхароў.

**СЛАБАДА КАМЕНЕЦ,** былы пасёлак у Каменскім сельсавеце. Каля в. Старая Каменка. Вядомы з 1750 г.

**СЛАЎГАРАД,** горад, цэнтр Слаўгарадскага раёна. Новая назва г.п. *Прапойск* з 23.5.1945 г. Існуе легенда, што Прапойск нібыта быў закладзены Слагорыдам, а галава горада піў дужа (уладальнік горада Дзмітрый Яншын) і прапіў яго. Толькі пасля вайны горад сталі зноў так зваць.

**СЛАЎНЯ,** вёска ў Свенскім сельсавеце. У апошняй чвэрці XVIII ст. належала князю Галіцыну, 39 двароў, 222 жыхары. У 1873 г. 275 рэвізскіх і 311 прышлых сялян. У 1884 г. у Навабычанскай воласці Быхаўскага павета, 107 двароў, у тым ліку 2 кравецкія, 1 калёсны, 1 бандарны, 2 кавальскія, 537 жыхароў, жыхары 20 двароў у адыходніцтве. У 1886 г. 103 двары, 686 жыхароў, вятрак, заезны дом. У 1909 г. 148 домаўласнікаў. У 1910 г. у Бычанскай воласці Быхаўскага павета, каля р. Слаўнянка, належала Слаўнянскаму сельскаму таварыству, 150 двароў, 1089 жыхароў. Адносілася да Ракцянскага праваслаўнага прыхода. У 1912 г. існавала аднакласная царкоўнапрыходская школа. У 1926 г. 790 жыхароў, двухкамплектная школа. Уваходзіла ў Гайшынскі, потым у Чарнякоўскі сельсаветы.

**СМАЛІГАЎ,** вёска ў Баханскім сельсавеце. Мясцовыя назвы *Смалюгуў*, *Смаллігуў*. Вядома з сярэдзіны XVIII ст. У 1886 г. пабудавана мураваная Троіцкая царква. У 1910 г. у Баханскай воласці Быхаўскага павета, належала Смалюгаўскаму сельскаму таварыству, 19 двароў, 125 жыхароў. Адносілася да Зімніцкага праваслаўнага прыхода.

**СОМАВА ХОЦІШЧА,** былы хутар у Лапаціцкім сельсавеце. Каля в. Красная Слабада (Чырвоная Слабада) і р. Проня. Назва паходзіць ад прозвішча Сомаў.

**СТАЙКІ,** былы маёнтак у Свенскім сельсавеце. Каля ручая Поцея. У 1910 г. у Бычанскай воласці Быхаўскага павета, належаў дваранцы Е.О.Вільчынскай; 23 двары, 6 жыхароў. Адносіўся да Гайшынскага праваслаўнага прыхода. У 1926 г. пасёлак, 83 жыхары. Іншая назва *Стая*.

**СТАРАЯ КАМЕНКА,** вёска, цэнтр Каменкаўскага сельсавета. На левым беразе р. Сож. Землі тут камяністыя, ад чаго паходзіць і назва вёскі. Прыгон каменцы служылі князю Крапоткіну. У 1884 г. 46 двароў, у тым ліку 2 кравецкія і 2 бондарскія, 386 жыхароў. У 1910 г. у Старынскай воласці Чэрыкаўскага павета, каля возера, належала Старакаменскаму сельскаму таварыству; 57 двароў, 462 жыхары. Адносілася да Гайшынскага праваслаўнага прыхода. У 1926 г. чатырохкласная школа. У 1961 г. 100 двароў.

**СТАРОЕ КЛАДБІШЧА,** былы хутар у Кульшыцкім сельсавеце. У 1911 г. каля в. Кульшычы.

**СТАРЫК,** былы хутар у Старынскім сельсавеце. У 1926 г. 3 жыхары.

**СТАРЫНКА,** вёска, цэнтр сельсавета. З 1777 г. вядома як *Рудня Старынка*. Там спачатку быў жалезаплавільны, потым медзеплавільны заводы. У сярэдзіне XVIII — пачатку XIX ст. колькасць рабочых вагалася ад 900 да 1500 чалавек. З 1828 г. с. Старынка ўласнасць Бенкендорфа, які валодаў 5178 дзесяцінамі зямлі, 2 вадзянымі млынамі і 2 корчмамі (1882). У 1844 г. пабудавана драўляная царква Аляксандра Неўскага. У 1886 г. цэнтр воласці Чэрыкаўскага павета, каля возера Старынскага, 85 двароў, 690 жыхароў, валасное праўленне, царква, школа. У 1910 г. належала Старынскаму сельскаму таварыству, 49 двароў, 377 жыхароў. Адносілася да Старынскага праваслаўнага прыхода. У 1926 г. 525 жыхароў, школа. Іншая назва *Старына*.

**СТАРЫНКА,** былая вёска ў Старынскім сельсавеце. У сярэдзіне XIX ст. уласнасць Бенкендорфа. У 1910 г. належала Старынскаму сельскаму таварыству, 20 двароў, 177 жыхароў. Адносілася да Старынскага праваслаўнага прыхода. У 1926 г. 174 жыхары.

**СТАРЫНКА,** былы фальварак у Старынскім сельсавеце. У 1910 г. належаў княгіні М.А.Крапоткінай, 1 двор.

**СТАРЫНКА,** былы пасёлак у Каменкаўскім сельсавеце.

**СТАЯ,** былы пасёлак у Свенскім сель-

савеце. Уваходзіў у Чарнякоўскі, потым у Гайшынскі сельсаветы. У 1926 г. 83 жыхары. Іншая назва *Стайкі*.

**СТРУШАЎ,** былы хутар у Кульшыцкім сельсавеце. У 1910 г. у Баханскай воласці Быхаўскага павета, 2 двары, 18 жыхароў. Адносіўся да Кульшыцкага праваслаўнага прыхода. У 1926 г. 49 жыхароў. Іншыя назвы *Струшава*, *Струшы*.

**СТРУШЫ,** былы хутар у Ржаўскім сельсавеце. Каля фальварка Бродніца.

**СЫЧОЎКА,** былы пасёлак у Гіжэнскім сельсавеце. У 1926 г. у Целяшоўскім сельсавеце, 39 жыхароў.

**СЫЧЫН,** вёска ў Старынскім сельсавеце. Існуе два варыянты паходжання назвы в. Сычын: ад слова *сыч* (птушка) і ад р. *Сычын* «балотніца». У канцы XVIII ст. вёска называлася *Слабада Сычын* ці *Слабада Січын* і *Вялікая Шышкаўка*. У 1926 г. 374 жыхары, чатырохкласная школа.

**СЯДЗІБА,** былы пасёлак у Гіжэнскім сельсавеце. У 1926 г. у Целяшоўскім сельсавеце, 43 жыхары.

**ТАЎКАЧОЎКА,** былая вёска ў Гіжэнскім сельсавеце. Вядома з сярэдзіны XIX ст., каля р. *Стары Сож*.

**ТРАСЛІВЕЦ,** былая вёска ў Гіжэнскім сельсавеце. На левым беразе р. Проня. У 1872 г. маёнтак. Уваходзіла ў Целяшоўскі сельсавет.

**ТРОСЛІЎКА (ТРАСЛІЎКА),** вёска ў Гіжэнскім сельсавеце. Назва паходзіць ад слоў *багна*, *зыб*, *зыбіна* ці выразу *трасі сліўкі* (слівы). У 1783 г. 19 двароў. У 1873 г. 139 жыхароў. У 1910 г. у Даўжанскай воласці Чэрыкаўскага павета, належала Тросліўскаму сельскаму таварыству; 61 двор, 449 жыхароў. Адносілася да Целяшоўскага праваслаўнага прыхода. У 1926 г. у Целяшоўскім сельсавеце, 351 жыхар, чатырохкласная школа. У 1961 г. 12 двароў.

**УЗГОРСК,** вёска у Лапаціцкім сельсавеце. Назва адлюстроўвае гарысты (узгоркавы) рэльеф каля р. Раста, на крутым правым беразе якой размешчана вёска. Паводле сведчання мясцовых старажылаў, вёска ўзнікла пасля адмены прыгону (1861). У 1783 г. 5 двароў, 19 жыхароў, у 1873 г. 41 рэвізскі і 43 прышлыя селяніны. У 1910 г. у Даўгамохскай воласці Быхаўскага павета, 22 двары, 123 жыхары. Адносілася да Цяплянскага праваслаўнага прыхода. У 1926 г. 191 жыхар, у канцы 1920-х гадоў каля 40 двароў.

**УЗМУТНАЕ,** былы хутар у Лапаціцкім сельсавеце. У 1926 г. у Гіжэнскім сельсавеце, 6 жыхароў.

**УЗМУТНАЕ,** былы хутар у Гіжэнскім сельсавеце. На левым беразе р. Проня. У 1910 г. у Даўжанскай воласці Чэрыкаўскага павета, належаў двараніну Э.Ф.Юноша-Шаняўскаму, 1 двор, 13 жыхароў. Адносіўся да Прапойскага праваслаўнага прыхода. У 1926 г. 10 жыхароў. Цяпер урочышча (луг, поле, возера), у якім каля 70 радзіміцкіх курганоў. У 1892 г. тут праводзіў раскопкі беларускі археолаг і краязнавец М.В.Фурсаў.

**УЗНІЗЗЕ,** былы пасёлак у Васькавіцкім сельсавеце. На правым беразе р. Пясчанка, каля ўрочышча Гарадок, на поўнач ад в. Папоўка. Існаваў да 1956 г.

**УЛУКІ,** вёска ў Лапаціцкім сельсавеце. Назва вёскі паходзіць ад таго, што размешчана яна на луцэ, якая ўтворана рэкамі Раста і Ляснянка, г.зн. знаходзіцца ў лукі, каля лукі. Старажылы таксама сцвярджаюць, што р. Проня адрэзала луку, выпраміла сваё ручво. Паселішча на луцэ і стала называцца Улукі. У 1783 г. 58 двароў, 282 жыхары. У 1896 г. належала купцу Мацейсону, які валодаў 3721 дзесяцінай зямлі, 3 вадзянымі млынамі, карчмой (1882). У вёсцы быў млын на р. Чыстая Лужа. У 1873 г. 89 рэвізскіх і 131 прышлы селяніны. У 1884 г. у Даўгамохскай воласці Быхаўскага павета, 43 двары, у тым ліку 3 кравецкія і 30 возчыцкіх, 314 жыхароў, хлебазапасны магазін. У 1910 г. належала Улуцкаму сельскаму таварыству, 70 двароў, 520 жыхароў. Адносілася да Рабавіцкага прыхода. У 1926 г. 611 жыхароў. У гады Вялікай Айчыннай вайны вёска спалена. Іншая назва *Улоскі* (1782).

**УЛУКІ,** былы хутар у Лапаціцкім сельсавеце. У 1910 г. належаў селяніну І.Валохіну, 1 двор, 5 жыхароў.

**УЛУКІ,** былы фальварак у Лапаціцкім сельсавеце. У гістарычных крыніцах упамінаецца ў 1823 г. Уваходзіў у маёнтак Улукі.

**УЛУКІ,** былы маёнтак у Лапаціцкім сельсавеце. У 1897 г. быў складзены план маёнтка Улукі, адзначана і воз. Рабавічы. У 1910 г. маёнтак належаў двараніну Н.Н.Краўчанку, 1 двор, 5 жыхароў. Адносіўся да Рабавіцкага праваслаўнага прыхода.

**УЛУКІ № 1,** былы пасёлак у Лапаціцкім сельсавеце. У 1926 г. 33 жыхары.

**УЛУКІ № 2,** былы пасёлак у Лапаціцкім сельсавеце. У 1926 г. 40 жыхароў.

**УРЭЧЧА,** вёска ў Васькавіцкім сельсавеце. Назва паходзіць ад таго, што вёска знаходзіцца на правым беразе р. Пясчанка, дзе злева ўпадае р. *Грушка* ці *Глушка*, а справа — *Руччы* з урочышча Дубінёўка, г.зн. *каля, у, пры рэччы, пры рэчках*. У інвентары за 1675 г. значыцца с. Урэчча і 6 дымоў, у 1681 г. на р. Пішчань дзейнічаў млын. У 1750 г. 37 дымоў. Паводле рэвізіі 1772 г., у в. Урэчча 181 жыхар (беглых 16 чал.). У 1873 г. 153 рэвізскія і 173 прышлыя душы. У 1884 г. 54 двары, у тым ліку 1 шавецкі, 2 кавальскія, 2 выраблялі драўляны посуд, 290 жыхароў, жыхары 2 двароў былі ў адыходніцтве, хлебазапасны магазін. У 1910 г. ва Урэцкім сельскім таварыстве, 119 двароў, 680 жыхароў. Адносілася да Прапойскага праваслаўнага прыхода. У 1918 г. было двухкласнае вучылішча. У 1926 г. 835 жыхароў. Уваходзіла ва Урэцкі, Ржаўскі сельсаветы. Іншая назва *Уроч'я* (1786).

**УСОХІ,** вёска ў Гіжэнскім сельсавеце. Назва Усохі быццам паходзіць ад таго, што калі прыйшлі першыя насельнікі, тут быў *усохлы лес* (сухастой). Вяскоўцы займаліся выганкай смалы і інш. Тут былі смалакурні, таму ўсохцаў называюць *смалякамі*. Аб шырокай вытворчасці смалы з карчоў сведчыць знойдзены *штам*, *штамб* (штамп) смалакурні. Старажылы сведчаць, што в. Усохі ўзнікла не так даўно, але да адмены прыгону (1861). На картах назва Усохі адзначаецца з 2-й паловы XVIII ст. У 1873 г. 96 рэвізскіх і 123 прышлыя селяніны. У 1884 г. у Прапойскай воласці Быхаўскага павета, хлебазапасны магазін. У 1910 г. у Даўжанскай воласці Чэрыкаўскага павета, належала Усохскаму сельскаму таварыству, 49 двароў, 370 жыхароў. Адносілася да Даўжанскага праваслаўнага прыхода. У 1912 г. існавала аднакласная царкоўнапрыходская школа. У 1926 г. 300 жыхароў.

**УСТАННАЕ,** вёска ў Лапаціцкім сельсавеце. Паводле падання, назва паходзіць ад таго, што тут было *ўстанія* (паўстанне) і мёртвымі паўстанцамі-сялянамі запоўнілі роў. У гістарычных крыніцах упамінаецца ў 1681 г. у Прапойскім старостве, 7 двароў (дымоў). У 1750 г. *Устанна*, 9 дымоў. На карце 1777 г. пазначана як *Усціна-Чыкаўка*. У 1783 г. Устанная, 25 двароў, 190 жыхароў. Паводле рэвізіі 1772 г., у в. Устаннае было 172 жыхары (беглых 4 чал.). У 1873 г. 54 рэвізскія і 69 прышлых сялян. У 1884 г. у Даўгамохскай воласці Быхаўскага павета, хлебазапасны магазін. У 1910 г. на р. Раста, 38 двароў, 267 жыхароў. Адносілася да Цяплянскага праваслаўнага прыхода. У 1926 г. 278 жыхароў. Дзейнічала чатырохкласная школа.

**ФАЛЬВАРК,** былы хутар у Гіжэнскім сельсавеце. Мясцовыя назвы *Хальварак*, *Холіварак*. У 1926 г. у Целяшоўскім сельсавеце, 31 жыхар.

**ФАЛЬВАРК,** былы пасёлак у Гіжэнскім сельсавеце. Мясцовыя назвы *Хальварак*, *Холіварак*. У 1926 г. у Целяшоўскім сельсавеце, 15 жыхароў.

**ХАЛЕЕВА,** былы хутар у Васькавіцкім сельсавеце. Назва паходзіць ад імя *Халалей*, *Халей*. Уладальнік быў родам з в. Новая Слабада (Бярозаўка).

**ХАЛОДНЫ РУЧЭЙ,** былы хутар у Старынскім сельсавеце. У 1926 г. 6 жыхароў.

**ХАЛЯЎКА,** былы пасёлак у Лапаціцкім сельсавеце. У 1926 г. у Іванішчавіцкім сельсавеце.

**ХАРАНЕЎ,** вёска ў Лапаціцкім сельсавеце. Мясцовыя назвы *Харанёў*, *Харанева*, *Харанёва*. Назва паходзіць ад слова *хараніць*, «хаваць». Паводле падання, *тут людзі схараніліся «ад француза»*. На карце 1777 г. разам з паселішчам пазначаны і вадзяны млын. У 1783 г. 26 двароў, 272 жыхары. У 1873 г. 114 рэвізскіх і 126 прышлых душ, уласнасць двараніна Русінава, які валодаў 237,5 дзесяціны зямлі, вадзяным млынам, ад чаго меў 300 рублёў прыбытку (1882). У 1884 г. у Даўгамохскай воласці Быхаўскага павета, хлебазапасны магазін, 44 двары, у тым ліку 1 возчыцкі, 258 жыхароў, жыхары 11 двароў у адыходніцтве. У 1910 г. на р. Раста, 72 двары, 460 жыхароў. У 1912 г. існавала аднакласная царкоўнапрыходская школа. Дзейнічала чатырохкласная школа.

**ХВАРАСЦЯНЫ,** вёска ў Лапаціцкім сельсавеце. Паходжанне назвы вёскі нібыта звязваюць з мясцовасцю, якая пакрыта кустамі, хмызняком. Існуе мясцовы выраз *адхвырасьціць*, г.зн. «пасцябаць

гнуткімі дубцамі». У інвентары Чачэрскага і Прапойскага староства за 1675 г. згадваецца як сяло з 13 дварамі (дымамі). У 1750 г. 21 двор (дым). Паводле рэвізіі 1772 г., 275 жыхароў (беглых 14 чал.). У 1783 г. у складзе ўладанняў князя Галіцына, 30 двароў, 257 жыхароў. У 1884 г. у Даўгамохскай воласці Быхаўскага павета, хлебазапасны магазін. У 1910 г. вёска на р. Раста, належала Хварасцянскаму сельскаму таварыству, 38 двароў, 234 жыхары. Адносілася да Цяплянскага праваслаўнага прыхода. У 1912 г. у вёсцы была школа граматы. У 1926 г. 296 жыхароў.

**ХІТРЫЛАЎКА,** былы пасёлак у Кульшыцкім сельсавеце. У 1926 г. 49 жыхароў.

**ХОДАНАВА,** былы хутар у Лапаціцкім сельсавеце. Назва паходзіць ад старажытнабеларускага імя Ходан (магчыма ад Хвёдар). У 1910 г. у Даўгамохскай воласці Быхаўскага павета, на р. Раста, належаў селяніну І.Валохіну, 1 двор, 5 жыхароў. Адносіўся да Рабавіцкага праваслаўнага прыхода. У 1926 г. 7 жыхароў.

**ХОДАРАЎ,** былы пасёлак у Гіжэнскім сельсавеце. Назва паходзіць ад імя Ходар (Тодар, Хвёдар). Узнік пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г., насельнікамі яго былі жыхары з вёсак Усохі і Аляксандраўка. У 1926 г. 81 жыхар.

**ХОДАРАЎ-1,** былы пасёлак у Гіжэнскім сельсавеце. Назва паходзіць ад імя Хвёдар, Тодар, Ходар. Узнік пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. насельнікамі яго былі жыхары вёсак Усохі і Аляксандраўка. У 1926 г. 37 жыхароў.

**ХОМІНА,** былы хутар у Старынскім сельсавеце. Назва паходзіць ад імя Хама, Хомка. У 1926 г. 199 жыхароў.

**ХОЎМЫ,** былая вёска ў Гіжэнскім сельсавеце. Каля в. Любаны. Назва паходзіць ад слова *хавацца* ці ад імя Хоўма. Упершыню згадваецца ў інвентары 1750 г. як в. *Хоўмы Слабада* Прапойскага староства з 3 дымамі. Цяпер урочышча (лес).

**ХОЦІШЧА,** былая вёска ў Кульшыцкім сельсавеце. Мясцовыя назвы *Хоцішч*, *Хотышча*, *Хотышч*. Назва паходзіць, відаць, ад назвы р. Хотышча, якая цячэ праз гэту вёску. Паводле падання, вёска ўзнікла ў 1893 г. на зямлі пана Трускоўскага. У 1910 г. у Даўгамохскай воласці Быхаўскага павета, каля балота Ухлясць, належала Хоцішчанскаму сельскаму таварыству, 42 двары, 282 жыхары. Адносілася да Кульшыцкага праваслаўнага прыхода.

**ХРЫСТАФОРАЎКА,** былая вёска ў Старынскім сельсавеце. На левым беразе Сожа. Назва вёскі паходзіць ад імя Хрыстафор. У 1910 г. у Старынскай воласці Чэрыкаўскага павета, каля ручая, належала Хрыстафораўскаму сельскаму таварыству, 51 двор, 424 жыхары. Адносілася да Старынскага праваслаўнага прыхода. У 1926 г. 651 жыхар. Дзейнічала пачатковая школа.

**ХРЫСТАФОРАЎКА,** былы фальварак у Старынскім сельсавеце. У 1910 г. у Старынскай воласці Чэрыкаўскага павета, 1 двор, 2 жыхары. Адносіўся да Старынскага праваслаўнага прыхода.

**ЦЕЛЯШЫ,** вёска ў Гіжэнскім сельсавеце. Назва вёскі звязваецца са словамі *целеш*, *цялеш*, *ціляшы*, *целешша*, *цяльпушша*, «мокрыя ад вады лес, бярвенні». Існуе паданне, што быў пан Цілеш. У 1783 г. 11 двароў, 104 жыхары. У 1848 г. с. Целяшы ў складзе казённага Гарадзецкага маёнтка, 19 двароў, вадзяны млын, возера і сажалка. На карце 1776 г. пазначана як *Телеги*. У 1858 г. у вёсцы ўжо існавала драўляная Ільінская царква, другую царкву быццам пабудавалі каля 1861 г. Адна царква згарэла ў 1933 г. У 1884 г. 90 двароў, у тым ліку 1 сталярны, 287 жыхароў, царква. У 1886 г. у Даўжанскай воласці Чэрыкаўскага павета, 296 жыхароў, вадзяны млын. У 1910 г. належала Целяшоўскаму сельскаму таварыству, 89 двароў, 566 жыхароў. Адносілася да Целяшоўскага праваслаўнага прыхода. У 1926 г. 528 жыхароў, чатырохкласная школа. сустракалася назва *Целяшоўка* (1864).

**ЦЕРАХОЎКА,** вёска ў Васькавіцкім сельсавеце. Назва паходзіць ад імя Церах. Паводле падання, вёска атрымала назву ад імя панскага арандатара (*рандаціля*), які арандаваў у пана зямлю з вёскай. У 1884 г. у Бычанскай воласці Быхаўскага павета, 65 двароў, у тым ліку 1 кавальскі, 261 жыхар, жыхары 3 двароў у адыходніцтве, хлебазапасны магазін. У 1910 г. належала Церахоўскаму сельскаму таварыству, 95 двароў, 672 жыхары. Адносілася да Гайшынскага праваслаўнага прыхода. У 1912 г. існавала аднакласная царкоўнапрыходская школа. У 1926 г. 825 жыхароў. У 1961 г. у складзе Гайшынскага сельсавета.

**ЧАРНЕЦ,** былы пасёлак у Старынскім сельсавеце. У 1926 г. 31 жыхар.

**ЧАРНЫШЫН,** былы пасёлак у Гіжэнскім сельсавеце. Назва асацыіруецца з паняццем «чорны лес» (альха, клён). У 1926 г. 39 жыхароў.

**ЧАРНЯКОЎКА,** вёска ў Свенскім сельсавеце. Паводле падання, назва вёскі, верагодна, звязана з тым, што тут кругом рос *чорны лес, была чарналесіца* (г.зн. дуб, клён, ясень, граб, ліпа, альха, асіна), *не было краснага лесу, сасны*. У 1873 г. 253 рэвізскія і 247 прышлых душ. У 1884 г. 74 двары, у тым ліку 1 кравецкі, 1 бондарскі, 502 жыхары, жыхары 14 двароў у адыходніцтве, хлебазапасны магазін. У 1886 г. у Навабычанскай воласці, 75 двароў, 549 жыхароў, вятрак, заезны дом. У 1910 г. у Бычанскай воласці Быхаўскага павета, належала Чарнякоўскаму сельскаму таварыству, 103 двары, 427 жыхароў. Адносілася да Хляўнянскага праваслаўнага прыхода. У 1926 г. 644 жыхары, чатырохгадовая школа. У 1961 г. у Гайшынскім сельсавеце, працавала сямігодка.

**ЧАЧОРАЎКА,** вёска ў Васькавіцкім сельсавеце. Назва паходзіць ад назвы р. *Чычарка*. У сярэдзіне XIX ст. згадваецца як фальварак, які ў 1910 г. належаў двараніну А.П.Мурамцаву; меўся 1 двор, 7 жыхароў. Адносіўся да Прапойскага праваслаўнага прыхода. У 1926 г. у пасёлку Чачораўка 55 жыхароў.

**ЧОРТАВЫ ШАВЯЛІ,** былы пасёлак у Васькавіцкім сельсавеце. Каля в. Бязуевічы. Назва ўтворана ад двух урочышчаў *Чортаўка* і *Шавялі*. Паводле сведчанняў мясцовых жыхароў, тут выразалі магутны лес на *цяжкія, чортавы палі*, з чарналесся. Назва ўрочышча Чортаўка таксама паказвае на непраходны тут лес, месца са зданямі. У 1926 г. у пасёлку 26 жыхароў.

**ЧОРТАЎКА,** пасёлак у Васькавіцкім сельсавеце. Каля в. Бязуевічы. Вядомы з часу сталыпінскай аграрнай рэформы (1906—1917). Існаваў да 1939 г.

**ЧЫКАЎКА,** вёска ў Лапаціцкім сельсавеце. Паводле падання, быццам Пётр І згубіў тут гадзіннік, які знайшоў селянін і не змог яго схаваць з-за гучнага цікання: «чык-чык-чык». У гістарычных крыніцах вёска згадваецца ў 1675 г. у Прапойскім старостве, мела 7 дымоў. У 1750 г. 8 дымоў, млын.

Паводле рэвізіі 1772 г., 116 жыхароў (беглых 1 чал.). У 1783 г. 19 двароў, 131 жыхар. У 1835 г. уладанне памешчыцы Цеханавецкай. У 1873 г. 48 рэвізскіх і 67 прышлых душ. У 1884 г. у Даўгамохскай воласці Быхаўскага павета, хлебазапасны магазін. У 1910 г. на р. Раста, належала Чыкаўскаму сельскаму таварыству, 42 двары, 244 жыхары. Адносілася да Даўгамохскага праваслаўнага прыхода. У 1926 г. 312 жыхароў.

**ЧЫСЦЬ,** былая вёска ў Слаўгарадскім гарсавеце. У метрыцы Прапойскай царквы за 1794 г. упамінаецца в. *Чысцы*.

**ЧЫСЦЬ,** былы фальварак у Баханскім сельсавеце. У 1910 г. у Баханскай воласці Быхаўскага павета, 1 двор. Адносіўся да Журавіцкага рымска-каталіцкага прыхода.

**ЧЫСЦЬ,** былы маёнтак у Кульшыцкім сельсавеце. Згадваецца ў метрыцы Прапойскай царквы (1853, 1858). Належаў памешчыку К.А.Каморскаму, у 1878 г. 536 дзесяцін зямлі. У 1910 г. 1 двор. Адносіўся да Журавіцкага рымска-каталіцкага прыхода.

**ШАЛАМЫ-1,** вёска ў Васькавіцкім сельсавеце. Мясцовыя назвы *Шыламы*, *Шламы*, *Шэламэ*. Назва вёскі паходзіць ад назвы рэльефа мясцовасці (*шаламкі, горы, узгоркі, бугрыста*). Сама вёска размешчана на ўзгорку і ў чашападобнай упадзіне паміж больш высокіх гравійных узгоркаў. Назва *шелом* са значэннем «узгорак, холм» сустракаецца ў «Слове аб палку Ігаравым». Паводле мясцовага падання, назва в. Шаламы звязваецца са значэннем «шум». Кажуць, калі прыкласці вуха ў летні поўдзень да гэтых мясцовых гор, гравійных узгоркаў, то абавязкова пачуеш там шум, звон, спевы, якія быццам чуюцца ад таго часу, як тут праваліліся калісьці гарады разам з людзьмі, цэрквамі. На гэтых жа гарах (паводле падання) зрэдку з'яўляюцца дастойным людзям вараныя жарабкі ці прыгожыя дзяўчыны. Яны выходзяць з гор і просяць чалавечай мовай, каб гэтыя дужыя, сумленныя і чыстыя ў маральных адносінах мясцовыя людзі прыўзнялі цяжкую юшку-накрыўку на гары. І тады адтуль хлыне вада моцным патокам і выйдуць гарады і людзі. Дастойнага ж чалавека конь абяцае абавязкова вынесці на сабе і выратаваць ад вады. Гэтыя людзі звычайна адмаўляюцца, а потым гінуць ад няшчасцяў (указваюцца канкрэтныя асобы). Іншае паданне сведчыць, што назва в. Шаламы паходзіць



Рэчка Пясчанка каля в. Шаламы-1. Здымак 1960-х гадоў.

ад значэння «шум, замарачэнне ў галаве; глупства; несамавіты, крыклівы чалавек». Быццам тут жыў некалі нервовы, шумны чалавек Шолам.

У 1675 г. у с. Шаламы 3 двары (дымы), у 1681 г. млын на р. Пішчань. Паводле рэвізіі 1772 г., 102 жыхары (беглых 3 чал.). У 1873 г. у в. Шаламы разам з Падазер'ем 153 рэвізскія і 181 прышлы селяніны. У 1884 г. у Прапойскай валасці Быхаўскага павета, 77 двароў, у тым ліку 1 шавецкі, 1 кавальскі, 300 жыхароў, жыхары 12 двароў былі ў адыходніцтве, хлебазапасны магазін. З 1908 г. дзейнічала чатырохкласнае вучылішча. У 1909 г. у в. Шаламы 55 домаўласнікаў. У 1918 г. у в. Шаламы (разам з Падазер'ем) 220 двароў, трохгадовае вучылішча. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. 8 беззямельных гаспадароў стварылі ў фальварку пана М.А.Пухалы-Ларанцэвіча кааператыўнае таварыства для апрацоўкі зямлі (кожны на сваім кані). У 1926 г. у в. Шаламы 933 жыхары. У 1929 г. Прапойскі зямельны аддзел арганізаваў 35 двароў шаламоўскіх хутаран у брыгаду *Купля* (па назве урочышча). У 1932 г. быў створаны калгас «Барэц», у які ўвайшло 30 гаспадарак. У 1939 г. усе хутаране ссяліліся каля былога панскага фальварка і ўтварылі вёску (брыгаду) Шаламы-2 (каля 200 двароў) ці *Шаламы Новыя*, *Шаламы Другія*. Брыгаду на месцы старой вёскі сталі называць *Шаламы Старыя* ці *Шаламы Першыя*. Калгас стаў мець адну назву «Барэц». Пасля перайменавання брыгады «Купля» ў «XVII партз'езд» так стаў называцца ўвесь аб'яднаны калгас. У выніку ўзбуйнення да в. Шаламы-1 былі далучаны Шаламы-2, Урэчча-1, Урэчча-2 ці Ленінскі. Цэнтральнай сядзібай калгаса «XVII партз'езд» стала в. Шаламы-1. У 1953 г. у вёсках Шаламы-1 і Шаламы-2 налічвалася 550 жыхароў.

**ШАЛАМЫ-2,** вёска ў Васькавіцкім сельсавеце. Узнікла ў 1939 г. са сселеных хутароў в. Шаламы-1.

**ШАШЭЙНАЯ БУДКА,** былая вёска ў Васькавіцкім сельсавеце. У 1926 г. у Чарнякоўскім сельсавеце, 9 жыхароў беларускага насельніцтва.

**ШПАЧКОВА,** былы хутар у Васькавіцкім сельсавеце. Каля в. Шаламы-1. Назва ад мянушкі (*шпачок* — птушка) гаспадара І.Г.Чарткова.

**ШЫРОКІЯ,** былы пасёлак у Гіжэнскім сельсавеце. У 1926 г. у Целяшоўскім сельсавеце, 35 жыхароў. Назва ад урочышчаў тыпу *Шырокія Поласы*, якіх многа на Слаўгарадчыне.

**ЮРЭВІЧЫ,** былы хутар у Кулышыцкім сельсавеце. На правым беразе р. Ухлясць. Узнік у 1900-я гады каля в. Хоцішча.

**ЯСЯНОВІЦА,** былы пасёлак у Васькавіцкім сельсавеце. Мясцовае тлумачэнне назвы вёскі звязана з тым, што тут многа было ясеняў. У 1926 г. 97 жыхароў. Іншая назва *Йісяновіца*.

*І.Я.Яшкін.*

**Крыніцы:**

Дембовецкий А.С. Опыт описания Могилевской губернии. Кн. 1—3. Могилев, 1882—1884;

Волости и важнейшие селения Европейской России. Вып. 5. Губернии Литовской и Белорусской областей. Спб., 1886, Россия;

Полное географическое описание нашего отечества. Т. 9. Спб., 1905;

Список населенных мест Могилевский губернии. Могилев, 1910;

Баркулабовская летопись // Полное собрание русских летописей. Т. 32. М., 1975;

Живописная Россия. Т. 3. 2-е изд. Мн., 1994.